

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 19 (2713) Год LIII | Беласток, 11 мая 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Змяняць, значыць затрымаць беларускасць

Як кожны год, у дзень 3 мая, у Прэзідэнцкім палацы ў Варшаве ладзяцца сустрэчы з заслужанымі дзеячамі краіны. У гэты дзень з 1921 года прысвойваюцца ім высокія дзяржаўныя ордэны. На гэты раз у ліку 46-ці ардэнаносцаў апынуліся беларусы: галоўны рэдактар „Нівы" Яўген Вапа і старшыня Беларускага гістарычнага таварыства Алег Латышонак. Прэзідэнт Лех Качынскі ўзнагародзіў іх Кавалерскім крыжам Ордэна Адраджэння Польшчы.

„Ніва" спытала ўзнагароджаных, як яны ўспрынялі гэтае прэстыжнае вылучэнне.

Алег Латышонак: — Для мяне гэта нечаканасць. Я лічу, што шмат людзей больш чым я заслугоўваюць такой узнагароды. Людзей, якія ў падполлі змагаліся за незалежнасць Польшчы, прэзідэнт падзяліў на тры падполлі: першае — якое змагалася ў час другой сусветнай вайны, другое — пасляваеннае і трэцяе — якое дзейнічала ў 1980-х гадах. Прэзідэнт слушна заўважыў, што людзі першага падполля змагаліся са зброяй у руках. Яны рызыкавалі жыццём. А мы — тыя, хто змагаўся за дэмакратыю, усё ж такой вялікай рызыкі на сябе не прымалі. Лічу, што шмат палякаў у Беластоку заслугоўвае гэтай узнагароды. І таму ордэн успрымаю не як узнагароду для сябе, але для людзей, з якімі я дзейнічаў у дэмакратычным руху. Справа ў тым, што беларуская нацыянальная меншасць была адзінай, якая тады стварыла падпольныя структуры і арганізавана змагалася з рэжымам. Думаю, што якраз гэта паўплывала на факт, што я і Яўген Вапа былі ўшанаваны і наш накірунак быў заўважаны.

— За „Салідарнасць" Вы пасядзелі ў турме. Ці гэта быў самы складаны момант у змаганні?

— Не. Для мяне было цяжкім тое, што доўгі час я адчуваў сябе самотным. Я нарадзіўся далёка па-за Беласточчынай, пасля вучыўся ў Кракаве. Я быў упэўнены, што пакуль не будзе свабоды палякам, то і беларусам не будзе свабоды. Я разумею чаму беларусы ўспрымалі „Салідарнасць" як польскі нацыяналістычны і нават клерыкальны рух. Аднак мне здавалася, што тут ёсць важнейшая, агульная праблема — трэба даць адпор гэтай сістэме.

— Ці лічыце, што зараз беларусам настаў добры час?

— Я б не сказаў, што зараз у нас добры час для беларусаў. І не будзе ён добры, пакуль не зменіцца сітуацыя ў Беларусі. Узнагароду я атрымаў з Варшавы і маю надзею, што гэта будзе заўважана ў Беластоку. Ідзе пра свядомасць, што беларусы могуць разам з палякамі будаваць вольную і багатую Польшчу, і што ў гэтым няма супярэчнасці.

— Як паводле Вас выглядала б беларуская меншасць, калі б у нас не было дэмакратычнага руху?

— З аднаго боку выглядала б як фальклорная меншасць, а з другога — успрымалі б нас з большай варожасцю, асабліва палякі на Беласточыне, бо бачылі б нас як апірышча посткамунізму. Тое, што існавала група, якая ў прынцыпе не памяняла свайго нацыянальнага вобліку і адкрылася на сучасныя грамадска-палітычныя працэсы, стала ўсім відавочным. Такі прыклад мае у Бельску-Падляшскім, дзе беларусы супрацоўнічаюць з правымі палякамі. Дваццаць гадоў таму цяжка было б такое ўявіць.

Яўген Вапа: — Як успрымаю маё вылучэнне? Гэта ўзнагарода ўсяму беларускаму асяроддзю, якое штодзень займаецца беларускімі справамі, людзям, якія ў пачатку 1980-х узяліся рабіць беларускую справу сваімі рукамі, якія стваралі беларускі студэнцкі рух, падпольныя выдавецтвы, а зараз дзейнічаюць у няўрадавых арганізацыях, займаюцца справамі школьніцтва, культуры, медыямі, людзям, якія прымаюць удзел у беларускіх выбарчых камітэтах. Гэтая ўзнагарода паказвае таксама грамадзянскія пазіцыі, што можна быць беларусамі, якія ў Польшчы будуюць сваю Малую айчыну. Для мяне менавіта гэты ордэн з'яўляецца падзякай за наш дэмакратычны ўклад у грамадскае жыццё краіны.

— Калі Вы зразумелі, што трэба быць змагаром за дэмакратыю?

— Я асабіста ніколі не лічыў сябе змагаром. Раблю тое, што звычайна выпадае кожнаму чалавеку, калі бачыць такую патрэбу. Я лічу гэта звычайнай часткай жыцця, калі лічыш, што нешта трэба змяніць, звычайна, па-чалавечы. А ў нашай рэчаіснасці змяняць — гэта значыць затрымаць беларускасць. Каб самому і наступным пакаленням быць беларусамі.

— А якімі мы павінны быць, каб мець сваю будучыню?

— Нікога і нічога не будзе, калі наступныя пакаленні не будуць умець пісаць і чытаць кірыліцу. Другая справа — гэта адукацыя, якая дае магчымасць поўнасцю пазнаць сваю гісторыю і культуру. Гэта справа добрых настаўнікаў і добрых праграм навучання. А калі ідзе пра справы грамадска-палітычнага плану, прыярытэтам лічу ўзнікненне трывалага беларуска-праваслаўнага камітэта, каб мець свайго прадстаўніка ў сейме. Гэта было б завяршэннем нармальнасці, як, напрыклад, у немцаў. На ўзроўні самаўрадаў, гмін мы павінны больш грунтоўна і выразна прадстаўляць наш беларускі пункт гледжання. А затым пойдуць і справы ўвядзення дапаможнай мовы, і двухмоўныя ўказальнікі.

— Як бацькі ўспрынялі Вашую ўзнагароду?

— Гэта было так нечакана... што яны не вераць у тое, што здарылася! Радуюцца, што нас прызналі, заўважылі і належным чынам ацанілі ў дзяржаве.

— А хто першы павіншаваў Вас?

— Першымі павіншавалі нас пасол РБ Павел Латушка, які быў сярод дыпламатычнага корпусу, і епіскап гайнаўскі Міран.

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на прынтэры або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 149** з прыпіскай на канверце: XII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **19 кастрычніка 2008 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў лістападзе 2008 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі вартасныя ўзнагароды.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

Сакратарыят конкурсу:
Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok, tel. 085 743 50 22.

Конкурс праводзіцца пры фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

9 770546 196000

... бо я — беларус

Зайшоў я на днях у адну дзяржаўную ўстанову. Чыноўнік, які сустрэў мяне, аказаўся вельмі ветлівым і добразычлівым. Але, дапамогшы мне ў справе, ён са шчырай цікавасцю запытаўся:

— Скажыце, калі ласка, а чаму вы размаўляеце па-беларуску?

— Бо я — беларус, — адказваю яму.

— Ды не, — усміхнуўся чыноўнік. — У гэтым я якраз не сумняваюся. Я меў на ўвазе, што калі ты беларус, то гэта яшчэ не прычына размаўляць па-беларуску.

Я пачаў спрачацца:

— Прабачце, — кажу, — кітайцы гавораць па-кітайску, немцы па-нямецку, французы па-французску, і ўсім ім дастаткова для гэтага простай прыналежнасці да сваёй нацыянальнасці. І калі чалавек беларус па нацыянальнасці, то гэта дастатковая прычына, каб хаця б у Беларусі ён гаварыў па-беларуску.

— На жаль, не, — сумна канстатаваў факт мой суразмоўца. — Каб я стаў на сваёй працы размаўляць на беларускай мове, то думаю, доўга тут не пратрымаўся б. Мае калегі вырашылі б, што я звязаны з апазіцыяй, і папёрлі б адсюль як непатрэбную анучу.

Сапраўды, пасля таго як прэзідэнт Беларусі правёў рэферэндум па мове і надаў рускай такі ж статус як і беларускай, увесь час сустракаеш людзей, якія не могуць зразумець прычын, чаму некаторыя людзі размаўляюць на роднай мове. Той простай і зразумелай прычыны што ты беларус ім мала. Яны ў яе не вераць.

— Так не бывае, — кажуць адны. — Беларуская мова неперспектыўная. Няма вышэйшых навучальных устаноў на беларускай мове. Нідзе на ёй не гавораць, ні ў выканкамах, ні на іншых цёплых працах.

— У нас дзве дзяржаўныя мовы, — апраўдваюць сваё нежаданне напружваць розум другія. — Беларусы могуць выбіраць, на якой мове ім размаўляць, і маюць поўнае права размаўляць па-руску.

— А ніхто не размаўляе па-беларуску, — з наіўнай шчырасцю маркуюць іншыя, — таму і я не гавару.

Гэта яшчэ самыя нявінныя меркаванні. Ёсць і такія, хто сцвярджае, што беларускай мовы ўвогуле не існуе. Што яе прыдумалі Купала з Коласам і іншыя нацыяналісты, якія хацелі адарваць беларусаў ад братняга рускага народа. А пасля яшчэ сцвярджаюць, што і такі народ як беларусы не існуе. Што і іх, беларусаў, таксама прыдумалі беларускія нацыяналісты.

Існуе і такі пласт людзей, якія думаюць, што калі чалавек размаўляе па-беларуску, то гэта яму прафесійна выгадна. Такія людзі пачынаюць выведваць ці ты не настаўнік беларускай мовы, ці… Пасля доўга думаюць і прыходзяць да высновы, што на Беларусі іншых прафесій, дзе прафесійна выгадна гаварыць па-нашаму, больш і няма.

Але большасць грамадзян Беларусі родную мову ўспрымаюць як прыкмету апазіцыйнасці чалавека. Той чыноўнік праўду казаў пра сваіх калег. І не толькі яны так мяркуюць, але і прадстаўнікі такіх колаў грамадства, якія з уладай аніяк не звязаны, акрамя страху. І ў нечым яны правы.

Беларуская мова сапраўды становіцца моваю беларускай нацыянальнай апазіцыі. Гэта як пароль, калі чуеш, што нехта размаўляе па-нашаму; значыць, убачыў свайго чалавека. Нават у нечым ён сябра. І калі ты бачыш яго ўпершыню, можаш усё адно звярнуцца да яго за парадай ці дапамогай, і ён табе дапаможа. Калі, зразумела, ты да яго звернешся па-беларуску.

Беларуская мова стала прыкметай змагарства і пераследу. Менавіта тых, хто гаворыць па-нашаму, арыштоўваюць на мітынгах, выганяюць з працы і вучобы, выклікаюць у міліцыю ды КГБ…

Аналізуючы гэтую сітуацыю, я з жахам прыйшоў да тае высновы (таму зноў пішу на тэму мовы, пра якую думаў што напісана ўжо ўсё), што на Беларусі з'явіліся людзі, якія ўжо баяцца гаварыць па-беларуску. Бо іх не так зразумеюць, палічаць апазіцыянерамі і яны будуць мець праблемы. І такіх людзей не так ужо і мала. І той чыноўнік, да якога я на днях завітаў, таму яскравае пацвярджэнне. Ён баіцца размаўляць на той мове, на якой гаварылі бацькі… Па-беларуску гаварыць стала небяспечна. А і двух дзесяткаў гадоў не прайшло з таго часу, калі беларуская мова была адзінай дзяржаўнай на сваёй Радзіме. Што будзе далей? Можа ў хуткім часе з'явяцца людзі, якія будуць баяцца прызнацца ў тым, што яны беларусы…

Віктар САЗОНАЎ

Польшча — Расія

Трэба прызнаць, што ніяк не ўдаецца суседства, а дакладней кажучы добрасуседства, паміж Польшчай і Расіяй. І прычынай гэтаму не сталінізм і не Савецкі Саюз ці сацыялістычны лагер, у які Польшча не па сваёй віне папала. І нават не Катынь. Гэтыя падзеі ўзмоцнілі, канешне, узаемную непрыязь, калі б не сказаць — варожасць. Але пачалася яна між імі значна раней і ніяк не выгасае. Так што з'яўляецца яна, можна сказаць, даволі даўняй, традыцыйнай, але і сляззлівай, крывавай.

Спачатку Польшча дала моцна пакурыць Расіі — на штыках сваіх падкідала ёй цароў-самазванцаў. З імі польскія войскі занялі Маскву і пагаспадарылі там уволю, што вельмі не спадабалася і надалей не падабаецца расіянам. „Смутным временем" называецца гэты перыяд у гісторыі Расіі. Пабывалі ў Маскве палякі і з Напалеонам…

Потым Расія дала моцна пакурыць Польшчы — цяпер ужо яна, можна сказаць, „прыгалубіла" частку Польшчы з Варшавай і пагаспадарыла яна тут доўга і ўволю, што ў сваю чаргу вельмі не спадабалася і надалей не падабаецца палякам…

Чару горычы і варожасці дапоўніла тут і барацьба за душы паміж Ватыканам-Варшавай і Масквой. Сілавое, бязлітаснае ўвядзенне і сілавая ліквідацыя канфесійных уній зусім падзяліла і разззлавала раней даволі дружалюбныя народы.

А найгорш, як і заўсёды, давялося тут беларусам і ўкраінцам — была разбітая іх унутраная еднасць. Канфесійная унія падзяліла іх на розныя, часта варагуючыя між сабой, палітычныя арыентацыі, з чым беларусы і ўкраінцы дасюль справіцца не могуць. Так беларускім і ўкраінскім коштам Варшава і Масква афармлялі свае палітычныя інтарэсы…

Але вяртаймася зноў да польска-расійскіх узаемаадносін. Гістарычна нарастаючую і абрастаючую ўзаемнымі крыўдамі непрыязь знаходзім як у іх пісаных гісторыях, так і ў вусных пераказах. Нават нацыянальныя літаратуры поўныя ўзаемных крытык і прэтэнзій. Вельмі выразна бачым гэта, напрыклад, у творчасці класіка польскай літаратуры Адама Мікалаевіча Міцкевіча і класіка рускай літаратуры Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. Адам Міцкевіч і Аляксандр Пушкін жылі ў гэтым самым часе, былі асабіста знаёмымі, добра ведалі і цанілі адзін аднаго — талент і творчасць. Нават самі перакладалі адзін аднаму творы на свае мовы. Абодва не любілі царызму і цярпелі ад яго. Пушкін з сябрамі расіянамі прымалі Міцкевіча ў Пецярбургу і як толькі маглі, хадайнічалі перад начальствам, каб аблегчыць лёс апальнага паэта. А вось глыбокага сяброўства не атрымалася паміж імі. І менавіта з-за празмерных польска-рускіх антыпатый.

Справа ў тым, што Міцкевіч крытыкаваў не толькі царызм з яго антынароднай палітыкай, ад якой і расіяне цярпелі, а татальна ўсё расійскае і нават расіян. У сваіх сатырах, напрыклад, Пецярбург ён называў сталіцай тыранаў, дзе пануюць лютыя маразы, дзе дамы са сваёй агароджай выглядаюць як астрогі, дзе жанчыны белыя, як снег, і румяныя, як ракі… Лічыў ён таксама, што Пушкін здрадзіў сваім ідэалам маладосці…

Аляксандр Пушкін адчуў сябе пакрыўджаным і даў адказ Міцкевічу:

Не верю чести игрока,
Любви к России поляка,
Француза — в дружбе,
Немца — без корысти в службе…

І менавіта так трактавалася і надалей трактуецца гэтая тэма многімі іншымі польскімі ды расійскімі пісьменнікамі і грамадзянамі.

Ці не пара, дзеля супольнага спакою і ўзаемнай карысці, усе былыя крыўды і прэтэнзіі паміж нашымі краінамі і народамі адкрэсліць тоўстай рысай… і распачаць паміж Польшчай і Расіяй новыя, прыязныя адносіны?!.

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Гадавіна Дэкларацыі

Зноў — як у гады ПНР прагучаў прапагандысцкі лозунг — адсвяткоўваўся Першамай. Свята людзей працы. Свята — перш за ўсё маніфестацыя на права чалавека да годнай працы. Успамінаю аб гэтым, паколькі так склалася, што сёлета выпадае таксама 60 гадавіна прыняцця Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Парыжы (10 снежня) Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека з трыццаці пунктаў. А ў яе стварэнні агромную ролю адыграла місіс Элеанар. Рузвельт, жонка прэзідэнта ЗША Фрэнкліна Дэляна Рузвельта, у 1947-1951 гг. старшыня Камісіі па правах чалавека ААН. У Дэкларацыі ў 23 Артыкуле аж у чатырох падпунктах названы працоўныя правы людзей. Адно з іх гучыць: „Кожны чалавек мае права на працу, на свабодны выбар работы, на справядлівыя і добрыя ўмовы працы і на ахову ад беспрацоўя".

Мінула 60 гадоў з часу, калі свет абегзлі здымкі, прадстаўляючыя Дэкларацыю, а гэты Артыкул — і не толькі пры нагодзе Першамая — варта сабе прыгадаць. Перш за ўсё варта 23 Артыкул прыпамінаць уладным элітам дзяржаў у цяжкай сітуацыі пасля трансфармацыі ладу і гаспадаркі.

Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека ў асноўнай меры вызначае прынцыпы датычныя трох паняццяў, прызнаных ужо Вялікай французскай рэвалюцыяй: Свабоды, Роўнасці, Братэрства. Першы Артыкул гучыць: „Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Яны надзелены розумам і сумленнем і павінны ставіцца адзін да аднаго ў духу братэрства".

У доўгі маёвы польскі уік-энд, прыгадваючы сабе змест Дэкларацыі, падумаў я аб Беларусі. Бо ж у 2008 г. лічыцца (святкаваная ў сакавіку) круглая гадавіна мараў аб свабодзе і незалежнасці Беларусі. Як сёння вельмі гучна чутны ўстаноўлены ў 1948 годзе, значыць, у трыццаць гадоў пасля ўпадку беларускіх незалежніцкіх мараў, 2 Артыкул УДПЧ: „Кожны чалавек павінен валодаць усімі правамі і ўсімі свабодамі, што абвешчаны гэтай Дэкларацыяй, без якога б там ні было адрознення, як напрыклад у адносінах расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных або іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, маёмаснага, саслоўнага або іншага становішча. Апрача таго, не павінна рабіцца ніякага адрознення на аснове палітычнага, прававога або міжнароднага статуса краіны або тэрыторыі, да якой чалавек належыць, незалежна ад таго, ці з'яўляецца гэта тэрыторыя незалежнай, падапечнай, несамакіравальнай, або як-небудзь інакш абмежаванай у сваім суверэнітэце".

Паколькі мінаюць гэтыя круглыя гадавіны ўстанаўлення Дэкларацыі і ўстанаўлення Беларускай Народнай Рэспублікі, прабаваў я неяк сабе каталагізаваць нават павярхоўна ўсе з'явы, звязаныя з шырока ўспрыманым парушаннем правоў чалавека ад часу, калі краінай кіруе Аляксандр Лукашэнка, значыць, ад 1994 г. Як кажа моладзь, адгадзі. Няўрадавыя арганізацыі, такія як Amnesty International, не ў змозе над гэтым запанаваць, або засяроджваюцца на індывідуальных інтэрвенцыях. Прэс-сакратар АІ у Польшчы Моніка Дэптула сказала мне:

— Не вядзем дакументацыі такіх правапарушэнняў. У кожным канкрэтным выпадку, калі маем дачыненне з правапарушэннем, арганізуем акцыі і распаўсюджваем інфармацыі аб кожным такім парушэнні.

Без сумнення найбольш скрупулёзна да справы падыходзіць Праваабарончы цэнтр „Вясна". На аснове інфармацый, якія я прачытаў толькі за сакавік і красавік, дайшоў я да высновы, што Элеанар Рузвельт у кантэксце Дэкларацыі правоў чалавека і ў сённяшнім яе еўрапейскім вымярэнні мусіла б займацца толькі Беларуссю, а была б яна, мабыць, так сама бездапаможная ў сваіх інтэрвенцыях як сённяшні Еўрапарламент, Еўрапейская камісія ці Кангрэс ЗША.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Балтыйскі рэгіён з'яўляецца адным з найбольш развітых ды адначасова дынамічных куткоў свету. У ім знаходзяцца такія краіны — усясветныя лідэры па ўзроўню цывілізацыйнага развіцця — як Нямеччына, Нарвегія, Швецыя, Данія ці Фінляндыя. Аднак мы рэдка ўсведамляем сабе, што інтэгральным элементам гэтай супольнасці з'яўляюцца таксама Падляшша ды Беларусь...

Беларусь — балтыйская дзяржава. Ды Украіна таксама

Куба ЛОГІНАЎ

Балтыйскі рэгіён з'яўляецца адным з найбольш развітых ды адначасова дынамічных куткоў свету. У ім знаходзяцца такія краіны — усясветныя лідэры па ўзроўню цывілізацыйнага развіцця — як Нямеччына, Нарвегія, Швецыя, Данія ці Фінляндыя. Аднак мы рэдка ўсведамляем сабе, што інтэгральным элементам гэтай супольнасці з'яўляюцца таксама Падляшша ды Беларусь. А гэты факт адкрывае шматлікія перспектывы, якіх выкарыстанне залежыць таксама ад нас саміх.

Дакладныя межы Балтыйскага рэгіёна вызначыць немагчыма. Аднак шведскія даследчыкі лічаць, што вырашальным з'яўляецца геаграфічны крытэрый, а менавіта тэрыторыя басейна Балтыйскага мора. Цікава, што гэты чыннік павязаны таксама з гістарычным, таму што суднаходныя рэкі працягам гісторыі служылі сродкамі сувязі ды аб'ядноўвалі жыхароў розных бакоў мора. Суднаходныя шляхі Віслы, Нёмана ды Заходняй Дзвіны разам з балтыйскімі партамі ў вусцях гэтых рэк істотна паўплывалі на эканамічную гісторыю Польшчы, Кіеўскай Русі ды Вялікага княства Літоўскага. Як важным для Рэчы Паспалітай быў экспарт збожжа Віслай, з перагрузкай яго ў партах Гданьска ды Эльбланга, не трэба нават нагадваць.

Станоўчы ўплыў Балтыкі асабліва моцна адчула старажытная Беларусь — не зважаючы на тое, што яна ніколі не мела марскога характару. Аднак менавіта праз тэрыторыю сучаснай Беларусі пралягаў славуты суднаходна-сухапутны шлях „з вараг у грэкі", які быў прататыпам пазнейшых ідэй балта-чарнаморскай супольнасці. Агульнавядома, што істотную ролю ў пачатках фармавання Кіеўскай Русі адыгралі вікінгі, якія прыбылі сюды з другога боку Балтыкі. Пазней у самым цэнтры падзей, якімі жыў Балтыйскі рэгіён, апынулася таксама Вялікае княства Літоўскае. Змаганне з тэўтонцамі, шведска-польскія ды шведска-расійскія сутычкі за дамінаванне на паўднёва-ўсходнім пабярэжжы Балтыкі, за кантроль над партамі ды рэчнымі шляхамі — усё гэта пакінула выразны адбітак у жыцці ды далейшай гісторыі беларускага народа.

Аналізуючы гісторыю ды сучасную геапалітыку, можна зрабіць даволі неспадзяваную выснову: Беларусь была ды застаецца ключавым элементам паўднёва-ўсходнебалтыйскай мазаікі, хаця ніколі не межавала яна з балтыйскім берагам ды не ўсведамляла сябе марской дзяржавай. Адкуль такое меркаванне?

Адказу на гэтае пытанне трэба шукаць у памежным характары Беларусі, якая адначасова належыць да Балтыйскага ды Чарнаморскага свету, да Усходу ды Захаду, Поўначы ды Поўдня. Праз тэрыторыю Беларусі праходзіць галоўны еўрапейскі вададзел, які адначасова з'яўляецца мяжою паміж двума вялікімі ды стратэгічна важнымі рэгіёнамі: Балтыйска-Атлантычным ды Чарнаморска-Міжземнаморскім. Што асаблівае — іначай чымсьці на недаступным карпацкім адрэзку гэтай гідраграфічнай мяжы, яе беларускі адрэзак ёсць нявострым, што ў ваенны час спрыяе захапленню чужымі войскамі, а ў час міру — развіццю транспарту ды гандлю. У раннім сярэднявеччы вікінгі вельмі лёгка пераадолелі гэты вададзел менавіта на тэрыторыі Беларусі ды паплылі сваімі суднамі на Дняпро, да Кіева ды далей на Чорнае мора. Гэты балта-чарнаморскі шлях стаў адной з важнейшых транспартных магістралей тагачаснай Еўропы, а тэрыторыя сучаснай Беларусі знаходзілася дакладна пасярэдзіне балта-чарнаморскага „воднага гасцінца".

У новых часах балта-чарнаморскія сувязі падтрымліваліся будаўніцтвам суднаходных каналаў, якія з'ядналі Прыпяць з Бугам ды Нёманам. Гэты шлях сарвала Чарнобыльская катастрофа, рачны транспарт значна страціў сваё значэнне, аднак гэта ніяк не зменшыла стратэгічнага значэння Беларусі ў Балтыйскім рэгіёне. Наадварот: месца рэк занялі аўтастрады, чыгунка ды нафта-газавыя трубы. Цяперашняя Беларусь з'ўляецца ключом да энергетычнай незалежнасці ды бяспекі ўсяго Балтыйскага рэгіёна. Гэта цудоўна разумеюць дзяржаўныя кіраўнікі ў Мінску, аднак яны не выкарыстоўваюць гэтых геапалітычных магчымасцей на карысць беларусаў.

Аднак у новых часах рэкі зноў сталі адыгрываць вызначальную ролю ў фармаванні балтыйскай супольнасці. Праўда, змяніліся прыярытэты. Цяпер рачная сістэма Беларусі зноў стала стратэгічна важнай для скандынаваў, аднак не з пункту гледжання камунікацый, але... аховы асяроддзя.

Усё гэта мае сваю прычыну ў... катастрафічным стане экалогіі Балтыйскага мора. Як бы мы не хацелі пра гэта думаць, дык Польшча і Беларусь значна „паспрыялі" ў давядзенні нашага унікальнага мора да мяжы экалагічнай катастрофы.

Яшчэ да 60-х гадоў мінулага стагоддзя панавала меркаванне, што мора ды акіяны настолькі бязмежныя, што яны могуць змясціць усе колькасці забруджанняў. Нават дзеячы экалагічных рухаў уважалі, што найлепшы спосаб, каб пазбыцца шкадлівага смецця — гэта затапіць яго ў моры. Такім чынам, напрыклад, міжнародная супольнасць „дала дабро" на захаванне ў глыбінях Балтыкі вялікай колькасці хімічнай зброі з часоў II сусветнай вайны, не думаючы пра катастрафічныя вынікі такога недальнабачнага дзеяння. А прапагандуючы „поспехі" індустрыялізацыі ды калектывізацыі, савецкім ды польскім камуністам нават на думку не прыйшло падумаць пра экалагічныя паслядоўнасці гэтых працэсаў. Шкадлівыя рэчывы ды біягены не толькі атруцілі нацыянальную каштоўнасць беларусаў — Нёман, але праз ягонае пасярэдніцтва сталі паступова знішчаць уразлівыя экасістэмы Балтыйскага мора.

Зразумела, што для беларускага народа, які не атаясамлівае сябе з Балтыкай, гэтая праблема — далёка не першачарговая. Аднак больш здзіўляе тое, што станам асяроддзя Балтыйскага мора зусім не пераймаецца таксама большасць жыхароў прыбалтыйскіх абласцей Расіі. Расіяне дагэтуль працягваюць выкарыстоўваць шкадлівыя тэхналогіі, а вадкія адыходы Калінінграда ды Пецярбурга без ніякай ачысткі трапляюць у мора. І хаця Расія прыняла шматлікія абавязкі па ахове балтыйскага асяроддзя, што выплываюць, напрыклад, з удзелу ў Хельсінскай канвенцыі (ГЕЛКОМ), то расійскія ўлады нават не думаюць іх выконваць. Вось, савецкая звычка паказаць партнёрам па арганізацыях балтыйскай супольнасці (напрыклад ГЕЛКОМ), што „мядзведзь" не мусіць зважаць на ніякія канвенцыі ды дамоўленасці.

Дык Балтыку ўсё-такі ахоўваць трэба, а дзеля таго неабходна значна зменшыць крыніцы забруджанняў, якія трапляюць у мора цераз рэкі. Менавіта таму ўразлівыя да праблемаў аховы асяроддзя скандынавы выдзяляюць суседзям з другога боку мора немалыя грошы на дапамогу ў рэалізацыі экалагічных праектаў.

Сярод краін паўднёва-ўсходнебалтыйскага рэгіёна Польшча, Літва, Латвія ды Эстонія дасягнулі ўжо істотнага прагрэсу ў параўнанні са становішчам з канца 1980-х гадоў. Вялікую ролю адыгралі ў гэтым еўрапейскія датацыі, якія паплылі ў гэтыя краіны шырокім ручаём. Дык пазбаўленыя еўрасаюзнай падтрымкі беларуская, украінская ды расійская часці басейна Балтыкі надалей застаюцца зонай экалагічнай пагрозы. Тут няма сартавальнага збору смецця, фільтрацыйных палёў для сцёкаў, а пра сучасныя „чыстыя" тэхналогіі вытворчасці ды праэкалагічную падатковую сістэму мала хто яшчэ думае.

Дык Еўрасаюз ды ягоныя фонды — гэта яшчэ не ўсё. Праэкалагічныя скандынавы маюць карысны вопыт ды вольныя сродкі, якімі радыя падзяліцца з расіянамі, беларусамі ды украінцамі дзеля змены гэтага становішча. Што здзіўляе — расіяне неахвотна рэалізуюць экалагічныя праекты нават тады, калі большасць коштаў фінансуюць фонды урадаў Швецыі, Даніі, Нарвегіі ды Фінляндыі. Ды на гэтай расійскай абыякавасці хочуць скарыстаць украінцы, якія ўплываюць на стан балтыйскага асяроддзя цераз рэкі Заходні Буг ды Сан. Праявай гэтага з'яўляецца, між іншым, ініцыятыва „Балтыйская Украіна" (інфармацыя пра яе даступная на партале www.baltic-ukraine.com). У яе выніку ўкраінскі ўрад запачаткаваў нават працэдуру далучення дзяржавы да Балтыйскай (Хельсінскай) канвенцыі. Украінцы не крыюцца з тым, што экалагічнае супрацоўніцтва — гэта для іх цудоўны спосаб далучыцца да перспектыўнай балтыйскай супольнасці, дзе варта прысутнічаць хаця б з-за таго, што там вырашаюцца нацыянальныя інтарэсы Кіева (ды Мінска). Выкарыстанне ўдзелу ў структурах балтыйскага супрацоўніцтва да блакавання будаўніцтва паўночнаеўрапейскага газаправода — гэта толькі адзін прыклад геапалітычных карысцей з прыналежнасці да рэгіёна Балтыкі.

Тым часам Беларусь мае значна большыя падставы называць сябе балтыйскай дзяржавай, чымсьці Украіна. Ды супрацоўніцтва са скандынавамі ды прыбалтамі — спрыяльнае нават для лукашэнкаўскай улады. Варта адзначыць, што марскім портам Беларусі з'яўляецца менавіта еўрапейская Клайпеда, а зусім не расійскі Калінінград. А прэзідэнт Лукашэнка таксама рады быў бы не дапусціць да будаўніцтва расійска-нямецкай трубы. У цяперашніх цяжкіх палітычных умовах у Беларусі ўсё-такі працуюць скандынаўскія экалагічныя праграмы, Беларусь бярэ актыўны ўдзел у працы міжнароднага Балтыйскага універсітэта ды рэалізуе крыху супольных беларуска-балтыйскіх экалагічных праектаў. Хаця, зразумела, хацелася б, каб гэтае супрацоўніцтва было больш развітым.

Таму падставы для развіцця балтыйскага накірунку беларускай замежнай палітыкі існуюць, хаця нават Украіна становіцца на гэтым полі больш актыўнай. Ці ў такой сітуацыі „Балтыйская Украіна" стане дарожным указальнікам таксама і для Беларусі? Час пакажа.

Аўтар з'яўляецца каардынатарам праграмы „Балтыйская Украіна" (www.baltic-ukraine.com)

А культура мусіць быць...

Падарожнічаў я ранішнім цягнікам з Чаромхі ў Беласток. Гэта было ў панядзелак 21 красавіка. Сядзеўшы ў рэйкавым аўтобусе, угледзеў я праз акно такі вось абразок: вартаўнікі службы аховы чыгункі вялі спрэчку з дзяўчынамі, якія здаваліся быць вучаніцамі. Неўзабаве да гэтай чацвёркі далучылася трох падлеткаў. Не чуў я іхняй размовы, але тут жа выявілася, што ахоўнікі чыгуначнага правапарадку засеклі маладых „джэнтльменаў" на... засмечванні перонаў. Дзве дзяўчыны і трох падлеткаў пад „эскортам" СОКу падаліся за латок „Руху" і пазбіралі раскіданае смецце. Вось, даражэнькія, якая цяперашняя моладзь! І добра дзеецца, што хтосьці на чыгунцы сочыць за парадкам. Нездарма ў народзе прытрымліваецца жарт: „Балаган — балаганам, але культура мусіць быць!"

(ус)

Ляўкова

Перасталі ездзіць пасажырскія аўтобусы

Зараз штораз цяжэй даехаць пасажырскімі аўтобусамі ПКС і іншых перавозачных фірм з Новага Ляўкова ў Беласток або ў Гайнаўку. Па суботах і нядзелях не курсіруе аўтобус ПКС а гадзіне 7^{12} у Беласток (наступны каля 12 гадзіны) ды а гадз. 6^{59} і 14^{07} у Гайнаўку.

Ад 1 мая г.г. прыватны перавозчык таксама ліквідуе курс а гадзіне 7^{11} у Гайнаўку.

Дык што ж — дажылі мы да таго, што трэба будзе — як гэта было перад вайной — пяшком у Гайнаўку, а то і ў Беласток хадзіць! Мая мама пра гэта мне гаварыла. Яна не адзін раз хадзіла з Ляўкова ў Гайнаўку да свайго бацькі (мая мама з вёскі Дольнае, цяпер як след па даўнім так называецца гарадская вуліца). Веласіпеды паявіліся значна пазней і толькі ў адной-дзвюх багатых сем'ях. Паглядалі на іх і зайздросцілі такой „штукі" ўласнікам. Вось такі настаў час! Перасядземся з аўтобусаў на ровары?!

Гайнаўка

Ухабісты тратуар

Зараз у Гайнаўцы асфальтавую маставую і тратуары хутчэй пабудуюць на кароткіх вуліцах. І не ў цэнтры горада, але і ў далёкіх ад цэнтра пасёлках.

А вось адной з даўжэйшых вуліц у Гайнаўцы з'яўляецца вул. Пілсудскага (раней вул. Вызвалення). Мае яна добрыя тратуары з брусчаткі на пачатку і ў канцы. Пасярэдзіне — а гэта доўгі адрэзак — тратуар зруйнаваны, няроўны ды ўхабісты. І яго ў бліжэйшыя гады не будуць рамантаваць. Няма ў планах.

18 красавіка г.г. ішоў я па гэтай вуліцы і ўбачыў, што тут у апошнія гады нічога не змянілася на лепшае. Тратуар вельмі дрэнны і, а было гэта пасля дажджу, на ім стаялі лужы.

Варта дадаць, што якраз на гэтай вуліцы вялікі рух аўтамабіляў у напрамку Кляшчэляў, Чаромхі і Сямятыч. Тут нават цяжка перайсці цераз маставую з аднаго боку на другі. Новы тратуар тут вельмі патрэбны!

(ян)

Ці смецце нас засыпле?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У масмедыях перыядычна, з пэўнай рэгулярнасцю, разгортваецца дыскусія аб больш строгай ахове Белавежскай пушчы і стварэнні на ўсёй яе тэрыторыі нацыянальнага парку. Час ад часу паяўляюцца трывожныя галасы аб высечцы старых дрэў ці знішчэнні прыпушчанскіх краявідаў у выніку гаспадарчай дзейнасці. Затое крыху збоку застаецца пастаянная ахова старадаўняга лесу, якой зацікаўленае мясцовае насельніцтва. У прыпушчанскіх гмінах будуюцца ачышчальні сцёкаў і людзі з паасобных мясцовасцей падключаюцца да каналізацыйнай сеткі. Выцясненне вугальных кацельняў нафтавымі або газавымі таксама выдатна папраўляе ахову пушчы. Хіба найбольш засталося зрабіць у галіне гаспадаркі смеццем — вынікам дзейнасці чалавека і прамысловасці. Адукацыя прыпушчанскага насельніцтва, пачынаючы з дзяцей і моладзі, у галіне аховы асяроддзя дала станоўчыя рэзультаты. Аднак яны незадавальняючыя, хаця б з-за нелегальных звалак смецця на акраінах Белавежскай пушчы і непадалёк яе. Хаця яны ліквідуюцца, аднак пасля частка аднаўляецца. Вельмі патрэбныя вонкавыя сродкі на інвестыцыі ў галіне гаспадаркі адходамі і смеццем, а пасля на пастаянную ўспамогу такой гаспадаркі.

Мяняюцца ўмовы гаспадарання

На працягу многіх стагоддзяў жыхары Белавежскай пушчы і яе наваколля патрапілі так гаспадарыць бытавым смеццем і вытворчымі адходамі, што яно не сваўляла сур'ёзнай пагрозы для асяроддзя. Яшчэ ў шасцідзесятых ці сямідзесятых гадах найчасцей пасля веснавых парадкаў сяляне збіралі смецце (расцярушаную салому, кавалачкі драўніны, падгнітую бульбу, парасткі бульбы) і вывозілі на блізкія, больш або менш легальныя, звалкі. Хаця ў смецці трапляліся кавалкі кабеляў ці шкла з-пад бутэлек, іх колькасць была невялікай. Каўбаса ці сыр прадаваліся тады ў папяровай упакоўцы і прыносіліся з магазінаў у палатняных сумках. На працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў вельмі многа памянялася. Бытавыя і вытворчыя адкіды сталі намнога больш шкоднымі для акружаючага асяроддзя. Мноства фольгавых мяшкоў, пластмасавых бутэлек ці электратэхнікі, якая знайшла ўжо падмену, вельмі шкодзяць асяроддзю. Апошнім часам моднай стала экалагічная адукацыя грамадства, без якой цяжка было б уявіць сабе жыццё ў суладдзі з натурай. Вялікая задача стаіць перад гміннымі ўладамі, якія цераз апарат чыноўнікаў, солтысаў і радных павінны дайсці з экалагічнай адукацыяй да насельніцтва сваіх гмін.

Як пазбавіцца смецця ў лясах і равах?

— Здаралася мне злавіць людзей, якія выкідалі смецце побач дарогі або ў іншых недазволеных месцах. Бывае нават, што гаспадары вывозяць сапсаванае сена, замест спаліць яго, загадзя паведамляючы пажарнікаў, каб не атрымаць штрафу за недазволеныя дзеянні, — кажа войт адной з гмін Гайнаўскага павета. — Хаця арганічныя бытавыя адкіды не так шкодныя як гарадское смецце, то ўсё ж такі іх трэба таксама вывозіць на гмінныя звалкі.

Сяляне з наваколля Гайнаўкі наракаюць, што побач іх вёсак, у ямы або іншыя невыкарыстаныя для сельскагаспадарчай дзейнасці месцы, вывозяцца адкіды. Сярод смецця можна знайсці і большыя прадметы, якія маглі прывезці гайнавяне. Войт Гайнаўскай гміны якраз звяртала ўвагу на ямы, распаложаныя побач могілак у Новым Беразове, з якіх людзі ў мінулым бралі пясок.

— Здаралася нават, што людзі, якіх мы лавілі па гарачых слядах, выкідвалі смецце, не даехаўшы нават да ямаў. Тлумачылі гэта тым, што на гарадской звалцы трэба было б плаціць, — удакладняе войт Вольга Рыгаровіч.

— Мы арганізуем збор смецця на акраінах Гайнаўкі і ў пушчы побач горада, бо некаторыя людзі там выкідаюць смецце, замест здаваць яго за невялікай аплатай Прадпрыемству камунальных паслуг ці на гарадскую звалку, — гаворыць намеснік бурмістра Гайнаўкі Васіль Сцепанюк.

Што рабіць са смеццем? — такое пытанне ставяць зараз кіраўнікі самаўрадаў, а Ваяводскі інспектар аховы асяроддзя націскае на іх, каб будаваць звалкі смецця ў адпаведнасці з еўрасаюзнымі патрабаваннямі. Нашы гаспадары, якія часта з'яўляюцца і пенсіянерамі, вывозілі смецце на свае вясковыя сметнікі і зараз ім цяжка зразумець чаму гмінныя ўлады іх закрываюць і застаўляюць сялян вазіць смецце часта ў аддаленыя месцы звалкі. Часта гэтыя звалкі (па адной на гміну) дапушчаныя да працы часова і дазволілі там складаваць бытавыя адкіды, бо ў іншым выпадку людзі выкідалі б смецце ў прыдарожныя равы. Патрабуецца таксама ад гмінных улад арганізаваць пастаянны нагляд за звалкамі смецця, бо прывезеныя на іх адкіды трэба перасыпваць прынамсі зямлёй, каб вецер не разносіў па наваколлі лягчэйшых матэрыялаў. Аб плаце за карыстанне звалкамі вырашаюць іх уладальнікі — камунальныя прадпрыемствы або гмінныя ўлады. Аднак за кожную прывезеную на звалку тону адкідаў трэба адводзіць грошы на ахову асяроддзя.

— Раней за кожную прывезеную на звалку тону смецця трэба было адвесці ў Маршалкоўскую ўправу 15 злотых, а апошнім часам гэтая плата павысілася на 75 злотых, каб было выгадней арганізаваць сартавальні смецця і атрымліваць назад адкіды да паўторнага выкарыстання, за якія няма аплатаў, а наадварот — заплацяць яшчэ грошы, — тлумачыць намеснік бурмістра Гайнаўкі Васіль Сцепанюк.

Куды здаваць электратэхніку?

Звычайнае смецце або няшкодныя для асяроддзя адкіды можна вывезці на гайнаўскую звалку. Праблемы паяўляюцца, калі трэба пазбыцца тэлевізара, радыёпрыёмніка, магнітафона або старых шын ад воза ці аўтамабіля.

— Калі ў Гайнаўцы купляеш новыя шыны для аўтамабіля, то ў магазіне прымуць старыя, але калі дома ляжаць яшчэ старэйшыя шыны, іх ніхто не хоча прымаць. Калі мой бацька завёз на гайнаўскую звалку старыя шыны і хацеў легальна іх скінуць, не прыкрыўшы смеццем, сказалі забраць іх дамоў, — расказвае Міраслаў з Гайнаўкі. — Таму людзі вывозяць шыны ці тэлевізары ў лес.

— Мы прымем стары тэлевізар, калі вы хочаце купіць у нас новы. Калі хочаце толькі здаць стары тэлевізар, папытайцеся пра гэта на скупцы лому, — раіў саўласнік аднаго з гайнаўскіх магазінаў з электратэхнікай, — паколькі з тэлевізараў атрымліваюць медзь.

Аднак на скупцы лому адказ быў рашучы

— Мы не бярэм ні тэлевізараў, ні халадзільнікаў, хіба што нехта забярэ ўсю сярэдзіну з халадзільніка і здасць нам толькі бляшаную ўпакоўку, — заявіла скупшчыца металалому з Гайнаўкі. — Медзь з тэлевізараў мы прымаем, але ўжо гатовую, а не ва ўсіх марках тэлевізараў знаходзіцца большая яе колькасць, каб варта было грабціся і шукаць медныя дэталі.

Яшчэ здараецца, што ў рамонтнай майстэрні могуць узяць сапсаваны тэлевізар, але толькі рускі (можа быць і беларускі). Аказваецца, што не ва ўсіх паслуговых пунктах у Гайнаўцы рамантуюць старэйшыя рускія тэлевізары менавіта з-за недахопу запчастак, якія можна выняць са старых. Запчасткі да тэлевізараў польскай або заходняй вытворчасці можна купіць на біржах і таму яны ўжо непатрэбныя нават для атрымання запчастак.

— Старыя тэлевізары і іншую электратэхніку, якую згодна новым указанням нельга выкідваць на звалку, можна здаць у Прадпрыемства камунальных паслуг у Гайнаўцы, зразумела, за адпаведнай аплатай, — тлумачыць намеснік бурмістра Васіль Сцепанюк.

Для добраўпарадкавання гаспадаркі смеццем і адкідамі ў Белавежскай пушчы і яе наваколлі неабходнае дафінансаванне з еўрасаюзнага і дзяржаўнага бюджэтаў праектаў будовы сартавальняў смецця, звалак, а таксама сістэмы збірання за невялікімі аплатамі смецця і адкідаў ад жыхароў прыпушчанскіх вёсак. Калі б у такі праект уключылася прынамсі еўрапейскае грамадства, якое актыўна выступае за захаванне натуральнага лесу ў сярэдзіне Еўропы, можна было б намнога лепш ахоўваць Белавежскую пушчу і пры сённяшніх яе гаспадарах, а ахова асяроддзя на іншых нашых тэрыторыях таксама важная.

(працяг будзе)

А маладосць не вернецца...

Уладзімір СІДАРУК

Калі вяртаюся ўспамінамі ў мінулае, тады інстынктыўна пападаю у меланхалічны настрой. Перад вачыма рысуецца бестурботнае дзяцінства, школьныя гады, маладосць. Гэта самы цудоўны перыяд маёй біяграфіі, які беспаваротна адышоў у адлеглую вечнасць. Не вернем мінулага часу, не вернем маладосці. Застаецца нам адно прыпомніць маладому пакаленню як тады да жыцця ставілася моладзь.

Грамадскую дзейнасць на культурна-асветнай ніве пачынаў я з сёмага класа пачатковай школы, калі быў членам Саюза польскай моладзі (ЗМП) і працягваў гэтую дзейнасць у Тэхнікуме сельскай гаспадаркі ў Бельску-Падляшскім, дзе пасля вучыўся. Калі ЗМП адмянілі і стварылі Саюз сялянскай моладзі (ЗМВ), я арганізаваў такі гурток у сваёй вёсцы. Старшынёю мы выбралі Алеся Рэпку. Гэта было ў жніўні 1958 г. Моладзь актыўна ўключылася у вір грамадскай працы. Напрыклад, у гонар III з'езда партыі гурток прыняў абавязацельства арганізаваць грамадскі пачын і высыпаць жужалем вясковую вуліцу (каля 1 500 метраў). Праўда, у гэтым саўдзельнічала ўся вёска, а нават па некалькіх чалавек з хаты выйшлі, але ідэя была наша. Пасля таго, як арганізавалі ЗМВ, змянілася жыццё моладзі. Арганізавалі мы драмгурток. Пры нагодзе дзяржаўных гадавін ці прыхадскога фэсту ладзілі мы святочныя вечарыны і забавы. Бурліла культурнае жыццё ў мясцовай святліцы. Праўленне гуртка выдавала насценную газету „Маланка" („Блыскавіца"), дзе на грамадскі суд выносіліся неакуратныя паводзіны моладзі і паталагічныя з'явы вясковага насельніцтва. Па гэтай прычыне мне, як рэдактару, прыходзілася слухаць непрыемныя эпітэты з боку аднагодкаў і старэйшых аднавяскоўцаў. У сакавіку 1960 года арганізавалі мы гурток Лігі прыяцеляў жаўнера (ЛПЖ) і мне выпала ўзначальваць яго. Сябрамі ЛПЖ, практычна, сталі члены ЗМВ, але яны добраахвотна аплачвалі належныя ўзносы і не бачылі ў гэтым праблемы. У гонар 1 Мая таго ж года моладзь удзельнічала пры пасадцы лесу ў Кляшчэлеўскім лясніцтве і пасадзіла 2 500 саджанцаў (на працягу трох гадзін). Арганізавалі мы мастацкую частку і выступілі з пастаноўкай Чужыніна „Пярэстая красуля". Актыўную дзейнасць праяўлялі тады Алесь Рэпка, Міхась Маркевіч, Анатоль Фралоў, Віктар Місюк, Толік Карпінскі, Мікалай Бышчук, Мікалай Маркевіч ды дзяўчаты: Ірэна Канарэўская, Вера Селях, Аня Рэпка, Люба Канарэўская ды іншыя. Моладзь ахвотна выязджала з пастаноўкамі ў навакольныя вёскі. Ладзіліся знаёмствы, затым сумесна арганізавалі культурныя мерапрыемствы.

Члены ЛПЖ з Чаромхі-Станцыі з апекуном, міліцыянерам Мікалаем Герасімюком (побач яго злева — аўтар)

На экскурсіі ў Пулавах

На зломе пяцідзесятых і шасцідзесятых гадоў буйна расцвіла праца маладзёжных арганізацый не толькі ў Кузаве, але і на ўсёй Гайнаўшчыне. Саюз сялянскай моладзі, Ліга прыяцеляў жаўнера (пасля перайменаваная на ЛОК — Лігу абароны краіны) і Беларускае грамадска-культурнае таварыства арганізаваліся ў самых адлеглых мясцінах. У гэтым часе ў гарадскіх асяроддзях і на прадпрыемствах ствараліся гурткі ЗМС — Саюза сацыялістычнай моладзі, а ў школах дружыны ЗГП — Саюза польскіх гарцэраў. Павятовыя структуры маладзёжных арганізацый у Гайнаўцы змяшчаліся на вуліцы Мар'яна Бучка 12. Старшынёю ЗМВ (нештатным) з'яўляўся Кастусь Ляшчынскі, а штатным сакратаром Ян Шумарскі. Пасля Ляшчынскага назначылі старшынёй Гарадской рады і яго заступіў Анатоль Скарбіловіч з Бельска-Падляшскага (родам з Аўгустова). Гарцэраў узначальваў Здзіслаў Глушэк, ЗМСам кіраваў Мікалай Казак, ураджэнец Белавежы, а інструктарам БГКТ быў Лявон Майсяюк, сябра Мікалая Казака. Неўзабаве Майсеюка перавялі на працу ў Беластоцкае радыё і мяне, як актыўнага маладзёжнага дзеяча, рэкамендавалі на інструктара Таварыства (чытай: „Быў інструктарам" — „Ніва" № 9 ад 26.02.2006 г). Варта адзначыць, што актыўную дзейнасць у вясковым асяроддзі праяўляў тады Саюз сельскагаспадарчых гурткоў і арганізацый (Związek Kółek i Organizacji Rolniczych), дзе старшым інструктарам працаваў Мікалай Гапунік. Запамяталася мне экскурсія ў Пулавы. Шматлюдная група ўдзельнічала ў гэтым падарожжы. Тады, здаецца, мы пазнаёміліся з Грышам Марозам.



У Пулавах. Злева: Нікалаюк з Новага Беразова, Бірыцкі з Семяноўкі і Уладзімір Сідарук

Зараз адно прыемныя успаміны засталіся і памятныя здымкі. Цяжка пералічыць даўнейшых сяброў, з якімі сустракаўся я ў Белавежы, на пасяджэннях маладзёжных арганізацый у Гайнаўцы ці Беластоку. Шмат з іх няма ў жывых. З кузаўскай кампаніі, напрыклад, адышлі Віктар Місюк, Міхась Маркевіч і мой самы лепшы сябра са школьных гадоў — Алесь Рэпка. Няхай ім зямля пухам будзе! Калі пішу гэты допіс, адчуваю вялікую прагу сустрэць сяброў з Махнатага, Навасадаў, Ласінкі, Нарвы, Арэшкава, Старога Беразова, Курашава і многіх вёсак Гайнаўшчыны, з якімі праводзіў я самыя цудоўныя дні маладосці на зломе пяцідзесятых і шасцідзесятых гадоў, калі супольна працавалі мы ў маладзёжных арганізацыях. А можа хтосьці з чытачоў адгукнецца і дашле ў рэдакцыю свой успамін з таго часу? Разважце, гэта, даражэнькія.

Удзельнікі пастаноўкі „Агонь на мяне" — злева: Міхась Маркевіч і Уладзімір Сідарук; стаяць: Віктар Місюк і Анатоль Фралоў

Удзельнікі падрыхтоўчых курсаў актывістаў ЗМВ у Белавежы: Оля Трашчотка (злева) і Вера Крук з Навасадаў, Янка Русіновіч (пасярэдзіне першага рада) з сябрам з Нарвы; за імі аўтар

Самагонка

Нядаўна пачуў па Беластоцкім тэлебачанні выказванне раднага Беластока, Кшыштафа Біля-Ярузельскага. Хоча ён заснаваць музей самагонаварэння і даказвае, што „ксенжыцоўкай" з ваколіцы Чорнай-Беластоцкай трэба толькі частавацца, бо яна найлепшая ва ўсёй краіне. Радны даказваў, што некаторыя ўласнікі самагоначных прылад гатовы перадаць іх у музей. Толькі дзе знайсці месца на яго пабудову? Тут варта сказаць, што такі дзеяч ад левых і дэмакратаў вядомы не толькі ў Падляшскім ваяводстве, а ва ўсёй нашай дзяржаве, ужо ўсё зрабіў, каб людзям жылося як у райскім садзе. Мабыць, сам добра ён частаваўся чарнабеластоцкім напоем! Я падкажу спадару Кшыштафу Білю-Ярузельскаму: няхай звернецца да маршалка Падляшша, каб той пад музей самагонаварэння выдзеліў невялікі кавалак пляца па вуліцы Вышынскага і вуліцы Герояў Монтэ-Касіна насупраць сваёй сядзібы ды аўтавакзала ПКС. Калі радны закончыць там пабудову музея і пачне выраб ужо сваёй уласнай „ксенжыцоўкі" па рэцэптуры адмыслоўцаў з-пад Чорнай-Беластоцкай, блізка будзе ўсім у гэты музей — і чыноўнікам, і самаўрадаўцам, і шафёрам, і пасажырам!..

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Яшчэ пра Журобічы

З цікавасцю прачытаў я рэпартаж Аляксандра Вярбіцкага „Журобічы" („Ніва" № 15). Сапраўды, гэта вельмі цікавая вёска. Пасля II сусветнай вайны памяняўся склад яе насельніцтва: многа праваслаўных сем'яў выехала адсюль, пераважна ў савецкую Беларусь, а на іх месца былі пераселены палякі, галоўным чынам з-пад Ашмян. І сёння склалася такая вось сітуацыя, што жывуць у вёсцы дзве сям'і Літвіновічаў: адны — праваслаўныя, карэнныя жыхары гэтай вёскі, другія — падашмянскія палякі.

На праваслаўных могілках захаваліся надмагіллі колішніх жыхароў Журобіч — дробнай падляшскай шляхты — Мураўскіх, Літвіновічаў, Мядушэўскіх. Сёння людзі з такімі прозвішчамі ў гэтым старонні то пераважна рымскія каталікі.

Была калісьці ў Журобічах не толькі святая вада, але і цудадзейная ікона Журобіцкай Божай Маці ў тамашняй царкве. Сляды колішняга культу захаваліся па сённяшні дзень. На прыхадскі фэст (св. Міхала) ідуць у Журобічы некаторыя жыхары Раманаўкі, гэтай яе часткі, якая была ў складзе колішняга Журобіцкага прыхода, а не як цяпер — Сямятыцкага.

М. Ц.

Забралі 5 вулічных тэлефонаў

Польская тэлекамунікацыя СА ліквідавала пяць вулічных тэлефонаў у Гайнаўцы: пры вуліцы 3 Мая і па адным па вул. А. Зіна і вул. Ліпавай. З іх можна было вельмі зручна патэлефанаваць на паліцыю ці хуткую дапамогу і г.д. Заўсёды тады, калі было гэта неабходна ў спешнай патрэбе.

ПТСА ліквідуе будкі з тэлефонамі ў гарадах і ў вёсках. У наш час, па ўсім відаць, лічыцца толькі прыбытак, а ўсё менш чалавек! **(ян)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Поспех не бярэцца з паветра!

Прыемна, калі сябры маюць дасягненні, заваёўваюць прызы, становяцца лаўрэатамі. Цягам бягучага школьнага года нас пазітыўна здзіўляе бельская „тройка”. Мы ўжо пісалі пра міжнародныя поспехі ў розных відах спорту, між іншым, у плаванні.

Звычайна бывае так, што поспехі ў спорце не ходзяць у пары з поспехамі ў навуцы. Добра, што такі нябяспечны прынцып не трымаецца „тройкі”. Тут атрымалася ідэальная сітуацыя. Можна нават сказаць, што спрацавала старажытная максіма: *У здаровым целе і дух здаровы.* Пра моц духу сведчыць незвычайны поспех у навуцы. У школе аж 17 лаўрэатаў і трох фіналістаў па прадметных конкурсах. Некаторыя гімназісты сталі падвойнымі лаўрэатамі. Сярод такіх шчасліўцаў апынуліся Магдаліна Якуц (біялогія і хімія) і Давід Яблушэўскі (матэматыка і інфарматыка). Сем асоб заваявалі званне лаўрэата па беларускай мове. Часам зайздроснікі дакараюць, што ў спаборніцтве з іншымі школамі балы набівае нам беларуская мова. І вельмі добра! Вялікая колькасць лаўрэатаў па беларускай мове гэта наш козыр. Тут многа лаўрэатаў па простай прычыне — конкурс вельмі папулярны сярод моладзі. Каб стаць лаўрэатам, трэба, як і па іншых прадметах, набраць пэўную колькасць балаў. Як відаць па сёлетніх выніках (аж 30 лаўрэатаў па беларускай мове), моладзь ведае спосабы як дасягнуць сваю мэту. І трэба сказаць, што маюць яны вялікае шчасце. Мала ў якіх школах настаўнікі так ангажуюцца ў поспехі сваіх вучняў.

Шкада, каб такі патэнцыял змарнаваўся! Ідзе пра тое, каб разам з поспехамі і магчымасцямі не забываць пра родную беларушчыну. Поспех не бярэцца з паветра. У нашых дасягненнях мы знаходзім мары сваіх бабуль ці прадзедаў, якія не мелі магчымасці вучыцца.

ЗОРКА

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Міра ЛУКША

Цяля з Цялушак

У Цялушках у цёткі Зосі
Цялятка прывяла пад восень
Рабая карова, што завуць яе Муня.
І тое цялятка ў Цялушках пад клуняй,
Пад хатай і ў краму за цёткай так ходзіць,
Дый без вяроўкі — бы яго водзіць
Як таго цюцьку яго гаспадыня.
Цялятка ў Цялушках ніхто і не спыніць:
Яно цёцю Зосю як маму кахае
І за спадніцу пыскай хапае!
Паілі з бутэлькі малое цялятка,
Праз соску смактала яно „вымя” маткі,
І, хоць ужо стала вялікай цялушкай,
Хоча на ручкі... каб яе гушкаць!
Вырасла песта ўжо — амаль матка.
Такая жывінка — з Цялушак цялятка!

ГІСТОРЫЯ ПРА ТОЕ, ЯК ВЫЙГРАЦЬ У ЛАТАРЭЮ

Гражынка ішла па горадзе, усміхалася красавіцкаму сонейку, і ёй хацелася зрабіць нешта незвычайнае. „Падараваць што-небудзь Валерыку!” — падумалася ёй раптам. Што-небудзь такое, што адначасна здзівіла б яго і абрадавала. Толькі што?

І тут ёй на вочы патрапіў шапік. Звычайны шапік з часопісамі, газетамі ды маляўнічымі паштовачкамі. Яна падышла да яго, і вочы дзяўчыны раптам успыхнулі радасна і загадкава...

А што ў гэты час Валерык? Ён таксама ішоў па горадзе, толькі па іншай вуліцы, і прыблізна такія ж думкі былі ў галаве ўзнёслага хлопца. Ён заўсёды вельмі любіў уручаць падарункі Гражынцы. І сам быў яшчэ болей рады, калі бачыў тады ўдзячны бляск на шчочках сваёй мілай абранніцы. Вось і ў гэты дзень... Хацелася парадаваць яе нечым цёплым, простым, нечаканым. І прыблізна такі ж шапік таксама трапіўся і яму на вочы...

А вечарам, калі Гражынка і Валерык сустрэліся, яны неяк загадкава зірнулі адно на аднаго і адначасна... уручылі адно аднаму па латарэйным білеце. І — весела рассмяяліся! Рассмяяліся ад дзіўнага супадзення: думак, жаданняў, няўлоўных красавіцкіх пачуццяў.

Латарэя была імгненнай. А таму ім нічога не заставалася, як акуратна сцерці ахоўны слой і... рассмяяцца яшчэ весялей і гучней! Таму што — на кожным білеце: стаяла аднолькавая сума выйгрышу: 25 злотых. Можа, нехта з вас усміхнецца, што мала? Аднак, хіба справа ў выйгрышу?! Не, справа ў іншым, зусім у іншым. Думаю, што гэтым разам вашаму дзядзечку не выпадае даводзіць „на пальцах”, у чым тут справа.

А калі нешта і даводзіць... Дык толькі адно: на вуліцы красавік, сонца, вясна! І мора, суцэльны акіян закаханых сэрцаў. Сэрцаў, з якімі проста не бывае, каб яны не сустракаліся і не закалыхваліся на аднолькавых хвалях. Каб не лучылі аднолькавыя прамяні. Каб іншым разам не сціналіся аднолькавым болем...

Ваш Дзядзечка Сід

9 красавіка 2008 г., Кобрын

Неўзабаве вясна!

Ох, як зялёна
цяпер наўкола!
Вясна шалёна
бяжыць па долах.
Абрыдла нам ужо
шэрая зімка,
пойдзем ахвотна
к вясне ў абдымкі!
Урэшце скінем
зімовы ўбор,
у лёгкім адзенні
выйдзем на двор.
Сярод лугоў
або ў небе
ўбачым буслоў
з раднёй паднебнай.
Ластаўка і шпак
рады, спяваюць:
„Нам добра так
у гэтым маі!”
І мы таксама
Яе прывітаем:
„Вясна-красна!
З зялёным маем!”

Эвеліна АРТЭМЮК

Гімназія ў Чыжах

У нашай школе працуе гурток беларускай мовы!

Прывітанне сябры! Нядаўна мы гасцявалі ў школе ў Шудзялаве на Сакольшчыне. Там існуе гурток беларускай мовы. Пра знаёмства з беларускімі песнямі, легендамі, прыказкамі і казкамі, а таксама пра сваю настаўніцу моладзь напісала ў гміную газету «Nasza». Допіс паказаўся ў пачатку года, пакуль на польскай мове. Нас вельмі цешыць, што навучэнцы беларускай мовы не замыкаюцца ў сваім кругу ды пра свае справы самі гавораць на старонках газеты. Большасць нашых сяброў гэта каталікі, якія лічаць сябе палякамі. Гурток вядзе матушка Людміла з Паўночнага Вострава. Паслухайце:

Мяне завуць Юстына Варановіч. Я жыву і вучуся ў Шудзялаве ўжо два гады. Раней я вучылася ў ПШ у Бабіках і там разам з сястрой Паўлінай і братам Паўлам мы сталі хадзіць на ўрокі беларускай мовы. Я прымала ўдзел у дэкламатарскім конкурсе ў Беластоку і Нараўцы. Наймілей успамінаю паездку ў Беларусь, якую спансараваў нам консул РБ. На экскурсіі мы пабывалі тры дні і пазнаёміліся з месцамі Адама Міцкевіча — патрона школы ў Бабіках.

У бабіцкай школе мы вучыліся пісаць, чытаць, дэкламавалі вершы і спявалі песні. Я і мае брат ды сястра, як найлепшыя вучні, атрымалі ад спадара консула цудоўны падарак — DVD. Пра нас пісалі ў беларускім тыднёвіку „Ніва", на старонках для дзяцей і моладзі „Зорка".

У мінулым годзе з намі працавала спадарыня Анна Сітэйка, а зараз мы займаемся са спадарыняй Людмілай Клімук. Мы развучылі многія песні (між іншым калядкі), цікавыя гісторыі і традыцыі, якія датычаць нашай зямлі. Заняткі адбываюцца ў аўторак, чацвер, часам у пятніцу. Нас 11 асоб: 8 дзяўчат, 2 хлапцоў ды настаўніца. Кожныя заняткі мы пачынаем з песні „Белы конь". Мы вельмі любім гэтыя заняткі, многаму вучымся і адначасова добра гуляем.

Юстына Варановіч

* * *

Я люблю заняткі беларускай мовы. Калі вяртаюся са школы, я пазітыўна здзіўляю сямейку веданнем «простай» мовы і такімі ж песнямі.

Уршуля Суравец

* * *

У нашай школе існуе гурток беларускай мовы, які вядзе спадарыня Людміла Клімук. На гэты гурток ходзіць 10 асоб. Мы вельмі ахвотна прыходзім на заняткі. Дзякуючы спадарыні Людміле, мы вучмся правільнаму вымаўленню слоў і спяваем песні. На занятках у аўторак і ў чацвер найчасцей спяваем песні. Дзякуючы гэтым сустрэчам, мы знаёмімся з беларускай мовай і культурай.

Караліна Чэрэмха

* * *

Мяне завуць Матыльда Буслоўская. Зараз я жыву ў Лазніках. Я нарадзілася і жыла ў Беластоку. У школу ў Шудзялаве я пачала хадзіць з пятага класа. Тут я пазнаёмілася з многімі мілымі людзьмі. У школе, апрача абавязковых прадметаў, вядуцца гурткі зацікаўленняў: між іншым гурток беларускай мовы. Вядзе яго спадарыня Людміла Клімук. На занятках я навучылася многіх беларускіх песень і слоў.

Мой дзедка нейкі час жыў у Беларусі. Часта ён апавядае мне пра сваё жыццё. Ён ведае многа прыказак, анекдотаў і беларускіх песень. Я хачу вывучыць беларускую мову, каб пазітыўна здзівіць дзядулю.

Матыльда Буслоўская

* * *

У нашай школе працуе гурток беларускай мовы, які вядзе матушка з Паўночнага Вострава Людміла Клімук — настаўніца польскай мовы.

Беларусь — наша ўсходняя суседка. Мая сям'я часта ездзіць у Беларусь, адкуль родам мая мама Святлана. За мяжой жывуць мае бабуля і цёця.

Наталля Алекша

* * *

На першых занятках спадарыня Людміла чытала нам беларускія кніжкі. Усе яны нас вельмі зацікавілі. Пасля мы самі спрабавалі чытаць, але не надта атрымлівалася. На чарговых уроках мы спявалі беларускія песні. Яны вельмі нам спадабаліся. На кожных занятках мы спяваем песні і вучымся новых. Найбольш спадабалася нам «А я ўсё дзіўлюся». З яе мы пачынаем кожны ўрок.

Нам вельмі падабаюцца заняткі беларускай мовы. Я заахвочваю ўсіх далучыцца да нас. Аказваецца, што нашыя культура і традыцыі вельмі падобныя на беларускія. У нас многа супольных гістарычных момантаў.

Эвеліна Казлоўская

PS. У красавіцкім нумары газеты «Nasza» сябры з Шудзялава напісалі вельмі прыгожую інфармацыю пра сустрэчу з «Зоркай».

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Вучні з дырэктарам Багданам Альховікам (першы справа), матушкай Людмілай і айцом Аляксандрам Клімуком

Музыка з кайфам

Беланогая як белая птушка

Напэўна помніце, што сярод беларускіх гуртоў, пра якія вам распавядаю, знайшлося і месца для сольнага выканаўцы Віктара Шалкевіча. Таму працягваю гэтую добрую задуму і сёння ў пару словах раскажу пра бардаўскую спявачку Таццяну Беланогую.

Ужо само прозвішча Таццяны пераносіць нас у нейкі іншы свет, дзе жывуць варожкі, птушкі і добрыя людзі. Здаецца, што Таццяна прыналежыць казачнаму свету і гэта напэўна з адной з беларускіх казак! Заглядаючы ў біяграфію, даведаемся, што спявачка па адукацыі, між іншым, прыродазнаўца, таму і пра птушак ёй так лёгка пішацца і спяваецца.

Не забуду, калі Таццяна перамагла на фестывалі „Бардаўская восень" у 2004 годзе, спяваючы кранаючую здаецца ўсіх, песню пра човен. Але на „Бардаўскай восені" ў Бельску яе кар'ера толькі што пачыналася. У тым жа самым годзе з'явіўся яе першы альбом „Там, дзе мы", на якім апынулася ажно 21 кампазіцыя! Да сённяшняга дня вакалістка паспела запісаць яшчэ два альбомы. Першы — „Пабачыць свет" — паказаўся свету ў 2006 годзе, а самая свежая прадукцыя гэта „Дзьвюхкроп'е". Апошні альбом з'явіўся дзякуючы перамозе на міжнародным фестывалі бардаў „OPPA 2006" у Варшаве, таму пры падрыхтоўцы альбома Таццяна мела магчымасць працаваць з прафесіяналамі.

Таццяна Беланогая сама здаецца ўжо прафесіянал. У такі спосаб падыходзіць яна да сваёй працы, так і ўспрымае яе крытыка. А яна падкрэслівае, што самымі важнымі для яе з'яўляюцца людзі; тыя, якіх яна сустракае, якія ёй дапамагаюць, якія проста з'яўляюцца людзьмі. Таццяна, як любіцель прыроды, вытаптала не адну сцежку ў лясах ці на палях, а зараз толькі пракладае дарожкі на музычным рынку, бо яе бардаўская творчасць аказваецца канкурэнтнай для камерцыйнай творчасці, якую сустракаем на музычных сайтах, дзе прынцыпова спяваюць па-беларуску.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 19

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 14:

Астра, Марс, тата, кампот, камп'ютэр, ар, мыш, шар, эпас. Макака, атам, рампа, Ас, пюрэ, кот, тэма, рыс, ажур.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Малгажата Гаворка, Агнешка Мароз** з Белгімназіі ў Гайнаўцы, **Каміля Бароўская** з Бабік, **Марыёля Анішчук** з Дубін, **Мажэна Дмітрук, Данеля Філіманюк, Паўліна Лаеўская** з Чыжоў, **Якуб Андрацкі** з Саколкі.

Віншуем!



Новае выданне

Літаратурная спадчына АЛЯКСЕЯ КАРПЮКА

Сяргей ЧЫГРЫН

У Мінску ў выдавецтве „Кнігазбор” з друку выйшлі „Выбраныя творы” Аляксея Карпюка.

Гэты ладны том твораў, які налічвае 600 старонак, шчыра кажучы, я чакаў даўно. Уклаў, напісаў прадмову і каментарый Аляксандр Фядута. Той самы Аляксандр Фядута, які ў 1994 годзе быў адным з членаў выбарчага штаба Аляксандра Лукашэнкі. Тады яго кандыдат перамог. Але тады ўжо не было Аляксея Карпюка: пісьменніка не стала 14 ліпеня 1992 года. Што сказаў бы Аляксей Нічыпаравіч маладому Фядуту, каб жыў ён да сённяшніх дзён — здагадвацца не трэба. Бо ў прадмове да кніжкі Фядута згадвае студзень 1991 года, калі Аляксей Карпюк выйшаў на мітынг у Гродне, пратэстуючы супраць захопу віленскай тэлевежы АМАПам пад кіраўніцтвам будучага намесніка міністра абароны Беларусі Уладзіміра Усхопчыка, супраць гібелі ні ў чым невіноўных людзей. Аляксей Карпюк тады, як і заўсёды, заставаўся самім сабой — тым самым Карпюком, які звык адстойваць праўду. Аляксандр Фядута ва ўступным слове да кнігі апраўдваецца перад Аляксеем Карпюком, што сёння яму сорамна, бо тады „я знаходзіўся з ім па розныя бакі барыкадаў. Я быў карэспандэнтам гарадской партыйнай газеты і напісаў рэпартаж з таго мітынгу. І калі мы сустрэліся праз два тыдні на той самай плошчы, я адчуў на сабе цяжкі і тужлівы погляд Аляксея Нічыпаравіча: ён ведаў, што я — вучань ягонай жонкі. Больш за тое, ён рэкамендаваў мяне яшчэ ў студэнцкія гады на семінар маладых пісьменнікаў (праўда, даведаўся я пра гэта толькі ў 2006 годзе). Але тады, на плошчы, ён не сказаў мне ні слова...”.

Вось так бывае. Але ўсяму гэтаму, як кажуць, Бог суддзя. Радуе сёння тое, што нарэшце з’явілася кніга твораў Аляксея Карпюка — бясстрашнага змагара за праўду і справядлівасць, таленавітага беларускага празаіка.

Аляксей Карпюк усё спелае жыццё пражыў у Гродне, хаця нарадзіўся ў вёсцы Страшава на Беласточчыне. Але да сённяшніх дзён у Гродне няма вуліцы, якая б насіла яго імя, ні мемарыяльнай дошкі, ні помніка. А ён быў і застаўся не толькі добрым пісьменнікам, але ён яшчэ быў лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа за кнігу „Сучасны канфлікт”, ён быў заслужаным работнікам культуры Беларусі, ён быў ветэранам Другой сусветнай вайны, ён быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Айчыннай вайны I і II ступені, залатым крыжам ордэна „Віртуці Мілітары” і шматлікімі медалямі.

Хто мне сёння назаве больш дастойнага гродзенца? Хто мне сёння назаве больш смелага і шчырага чалавека, якім быў Аляксей Нічыпаравіч? Хачу сказаць, што якраз сёння і не хапае ў Гродне такой асобы, якою быў Аляксей Карпюк. Асобы, якая аб’яднала б усіх таленавітых гродзенцаў у адну „Паходню”. Таму цяпер гродзенскія літаратары, выкладчыкі, гісторыкі, краязнаўцы, журналісты, палітыкі, студэнты выжываюць кожны пасвойму, па-рознаму, паасобку. Пра некаторых ранейшых гродзенскіх актывістаў і творцаў зусім нічога не чуваць. А гэта, вядома, трывожыць...

Кніга „Выбраных твораў” Аляксея Карпюка яшчэ раз паказвае сучаснаму чытачу пісьменніка як мастака і як чалавека. Менавіта таму яго мастацкая проза ў кнізе прадстаўлена вяршынным творам — аповесцю „Данута”, якая да сённяшніх дзён лічыцца адной з лепшых аповесцей пра каханне, напісаных на беларускай мове.

З мемуарнай прозы Аляксея Карпюка складальнік кнігі вынес на суд чытачоў яго ўспаміны „Развітанне з ілюзіямі” — сапраўдны дакумент і ацэнка той аднапартыйнай камуністычна-бюракратычна-чыноўніцкай сістэмы, пры якой мы жылі шмат дзесяцігоддзяў. Дзіву даешся, на колькі смелым быў Аляксей Карпюк, смелы словам, парадамі, а таксама фізічна. І яго ўсё ж баяліся, баяліся яго шчырага слова і, магчыма, баяліся, каб ён часам не трэснуў у лоб.

Аляксей Карпюк

У сваіх успамінах, якія чытаюцца на адным дыханні, пісьменнік трапна дае характарыстыкі партыйным наменклатуршчыкам абласнога кшталту, характарыстыкі гэтыя смешныя, часам анекдатычныя. Пра адзін выпадак, звязаны з былым старшынёй Гродзенскага аблвыканкама М. Малочкам, хочацца згадаць. Малочка аднойчы вырашыў ашчаслівіць аднавяскоўцаў. Родам ён быў з беднай вёсачкі Плецянічы Зэльвенскага раёна. Мясцовасць, напэўна, названа ад беларускага дзеяслова, плесці’. Назва паходзіла хутчэй ад рамяства жыхароў, якім у даўнія часы займаліся, — плялі, мабыць, рыбалавецкія прычындалы і торбы. Але зразумець гэтыя прамудрасці новаспечанаму вучонаму сельскагаспадарчых навук тады было не пад сілу. Назву Малочка палічыў абразлівай. Звязана, маўляў, з праклятай народам, плетью’ (а гэта чыста рускае слова, яно ў нас ніяк не магло пусціць такія карані, каб паслужыць для назвы вёскі!), якой шчодра карысталіся паны і памешчыкі, дык няўжо і цяпер яе славіць?! Маючы даную яму народам уладу, Малочка рашэннем Гродзенскага выканкама назву замяніў на Чырвонае Сяло. Але ўдзячнасці ад землякоў усё роўна не атрымаў. Калі неўзабаве прыехаў на радзіму для сустрэчы і з трыбуны хваліў савецкую ўладу, што яму, маўляў, з былога батрака і пастуха дала магчымасць вырасці да „чырвонага губернатара” (цытата з яго прадмовы ў сельскім клубе), — несвядомыя аднавяскоўцы так і не змаглі ацаніць належным чынам яго грамадскі ўчынак: пракалолі высокапастаўленаму земляку ў „Волзе” ўсе чатыры скаты.

„Развітанне з ілюзіямі” — гэта не толькі мастацкі твор, але і дакументальны. Вось як згадвае Аляксей Карпюк пачатак вайны і вызваленне на Беласточчыне. „У радыусе 25 кіламетраў ад майго Страшава на трох вайсковых аэрадромах — на самым Свіслацкім, куды мы з братам вазілі камяні, на Кватэрскім і Заблудаўскім — нямецкія бамбавозы спалілі нашы самалёты — усе да аднаго — у першую гадзіну вайны, а на кожным аэрадроме стаяла па дзевяноста два — дзевяноста пяць баявых машын...”, — піша пісьменнік. Далей пра вызваленне: „Беласток нашы занялі 26 ліпеня. У часы акупацыі ў ім былі даволі актыўныя антыфашысцкія групы. Адзін вузел такіх падпольшчыкаў узначальвала Ліза Чапнік (пасля вайны працавала ў Разанскім педінстытуце) — падпольная клічка „Марыся Мразоўская”. Яна мела завербаваных відных адміністратыўных кіраўнікоў Беластоцкага бецырка, якіх у сваю чаргу ўзначальваў нямецкі інжынер Артур Шадэ. Убачыўшы першых байцоў Чырвонай Арміі на вуліцах Беластока, Марыся запатрабавала ў камандзіра, каб нямецкіх антыфашыстаў перадаць нашым савецкім арганізацыям. Неўзабаве з’явіліся прадстаўнікі „СМЕРШа”. Выслухаўшы Мразоўскую, першае, што яны зрабілі, — абрабавалі ўшчэнт Артура Шадэ і яго сяброў — інжынераў Отта Бусэ, Бэнэшэка, Боле, адбіраючы ў іх чамаданы. Ды яшчэ на допыце іх да крыві збілі. Гэтак абышліся з нямецкімі патрыётамі, якія ў свой час перадалі партызанам планы апорных пунктаў Беластока, асабовыя справы на здраднікаў, медыкаменты і нават — сувоі сукна і цэнтнеры каўбасы...”.

„Развітанне з ілюзіямі” можна чытаць і перачытваць, бо гэтыя ілюзіі ўзрушваюць чытача сваёй шчырасцю і суровай самаацэнкай.

У кнізе Аляксея Карпюка, разам з празаічнымі творамі, упершыню знайшлося месца і п’есе „Канец свету”, напісанай пісьменнікам паводле свайго рамана „Вершалінскі рай”. П’еса гэта ў Беларусі не ставілася.

Цікавым атрымаўся ў кнізе і раздзел публіцыстыкі, пісем. Ён распачынаецца тэкстам выступлення Аляксея Карпюка на V з’ездзе пісьменнікаў БССР у Мінску 13 траўня 1966 года. Тое выступленне старэйшыя пісьменнікі Беларусі згадваюць і сёння. А казаў тады гродзенскі творца пра тое, што калі пісьменнік напіша добры твор, які дагэтуль не пісалі, то покуль дойдзе ён да народа, аўтару трэба часам патраціць куды болей сілы, чым для яго напісання. Аляксей Карпюк шчыра і адкрыта сказаў пра жыццё пісьменніка на перыферыі, пра Васіля Быкава і Анатоля Іверса і г.д. „Давайце ствараць адпаведную атмасферу пісьменнікам. Не тузайма літаратараў. Не арганізоўвайма калектыўных лінчаванняў, не вешайма на іх ярлыкоў...”, — заклікаў тады Аляксей Карпюк. А гэтае выступленне і словы яго актуальныя і сёння. Бо нічога цяпер у Беларусі не памянялася ў адносінах да пісьменнікаў, а стала яшчэ горш... Своеасаблівым прарокам быў наш Аляксей Карпюк.

У кнізе апублікаваныя і некаторыя лісты пісьменніка да Іны Карпюк, Янкі Брыля, Максіма Танка, Міхася Забэйды-Суміцкага, Пятра Машэрава, Васіля Быкава і нават Міхаіла Гарбачова. А ў дадатку да кнігі змешчаны ўспаміны пра Аляксея Карпюка. Гэта ўспаміны Васіля Быкава, Барыса Клейна, Вольгі Іпатавай, Ніны Ляшчонак.

Быў знаёмы з Аляксеям Нічыпаравічам Карпюком і я. Мы пазнаёміліся 15 траўня 1987 года ў Слоніме. Тады ён узначальваў Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі і з групай гродзенскіх літаратараў прыехаў у горад над Шчарай віншаваць з 75-годдзем старэйшага заходнебеларускага паэта Анатоля Іверса. Вечарына адбылася ў раённым Доме культуры. Я яе вёў і неяк трохі хваляваўся. Учарашні студэнт і раптам такая адказная місія. Перад пачаткам вечарыны Аляксей Нічыпаравіч кажа:

„Не хвалюйся, Сяргей, вядзі сябе спакойна і проста. Тут няма перад кім хвалявацца...”.

Перачытаў я кнігу „Выбраных твораў” Аляксея Карпюка і прыгадаліся гэтыя словы. А можа і праўда: не трэба ні перад кім сёння хвалявацца?.. А вучыцца заўсёды ў Аляксея Карпюка яго смеласці, адкрытасці і цярпенню.

Якуб Сакалоўскі трапіў у Белавежу ў верасні 1821 года. Запрасіў яго сюды сам барон Брынкен, які з 1818 года займаў пасаду галоўнага надлеснага Каралеўства Польскага. Мастаку спадарожнічаў гравёр многіх яго эскізаў Фрыдэрык Крыштоф Дзітрых, які ў 1820 годзе атрымаў званне каралеўскага лоўчага...

Мастацкая паездка Якуба Сакалоўскага ў Белавежу

Пётр БАЙКО

Від Белавежы. Эскіз Якуба Сакалоўскага. 1821 год

Думаю, што не шмат асоб ведае, хто з'яўляецца аўтарам эскізаў, памешчаных у прысвечанай цару Мікалаю I кніжцы барона Юльюша Брынкена пз. „Mémoire descriptif sur la foret impériale de Białowieża, en Lithuanie" („Мемуарнае апісанне каралеўскага Белавежскага лесу на Літве"), выдадзенай у 1826 годзе ў Варшаве. Дарэчы, гэтая кніжка з'яўляецца першай прыродазнаўчай манаграфіяй Белавежскай пушчы. Эскізаў у ёй усяго толькі чатыры. Паказваюць яны: від на Белавежу, выезд на паляванне, літоўскага зубра і лася. Дэкаратыўнымі матывамі ўпрыгожана таксама далучаная да кніжкі карта Белавежскай пушчы. Кожны з нашых чытачоў, які хаця б павярхоўна азнаёміўся з сучаснай літаратурай, прысвечанай белавежскаму лесу, напэўна добра запомніў першы з названых эскізаў. Яго шырока рэпрадуктуюць у розных кніжках, трапляе ён час ад часу на старонкі часопісаў. Наогул, гэта першая вядомая нам гравюра, на якой паказаны агульны выгляд Белавежы. Аўтарам эскізаў з'яўляецца чарцёжнік, жывапісец і графік Якуб Сакалоўскі, які жыў на зломе XVIII і XIX стагоддзяў. На жаль, барон Брынкен „забыў" назваць прозвішча ілюстратара сваёй векапомнай працы.

Якуб Сакалоўскі трапіў у Белавежу ў верасні 1821 года. Запрасіў яго сюды сам барон Брынкен, які з 1818 года займаў пасаду галоўнага надлеснага Каралеўства Польскага. Мастаку спадарожнічаў гравёр многіх яго эскізаў Фрыдэрык Крыштоф Дзітрых, які ў 1820 годзе атрымаў званне каралеўскага лоўчага. Я. Сакалоўскі меў удзельнічаць у паляванні на зуброў у Белавежскай пушчы (так прынамсі сцвярджаецца ў адной з яму прысвечаных прац). Мне ў сваю чаргу здаецца, што быў гэта бадай адлоў гэтых жывотных для звярынца ля Скярневіцаў. Паказвае на гэта прысутнасць у той жа час у Белавежы Ф. К. Дзітрыха, які, прымаючы пасаду лоўчага, атрымаў адначасова заданне арганізаваць паводле ўласнага плана скярневіцкі звярынец. Паляванняў на зуброў крыніцы не ўлічваюць ані ў 1821, ані таксама ў наступным годзе. Дзесяцігадовага зубра застрэлілі толькі 15 лютага 1823 года і стаў ён экспанатам у Музеі Школы асаблівай лясніцтва. У верасні 1821 года ў Белавежы знаходзіўся таксама барон Юльюш Брынкен. Паўторна наведаў ён Белавежскую пушчу ў лютым 1823 года, найхутчэй у сувязі са згаданым паляваннем.

Якуб Сакалоўскі выканаў у Белавежы больш эскізаў, чым тыя чатыры ў працы надлеснага. У калекцыі Нацыянальнага музея ў Кракаве, які захоўвае 188 эскізаў і акварэляў мастака, знаходзім м.інш. працы „Аблаўшчык з Белавежы" і „Лясніп'яніца з Белавежы" (аказваецца, п'янства сярод белавежскага лясного брацтва мае сваю шматвяковую традыцыю!). Нацыянальны музей у Варшаве ў сваю чаргу захоўвае алейную карціну „Паляванне" — адзіную захаваную працу мастака, выкананую гэтай тэхнікай.

Пасля Яна Генрыка Мюнца, які маляваў у Белавежскай пушчы ў васьмідзесятых гадах XVIII стагоддзя, Якуб Сакалоўскі з'яўляецца другім мастаком, які ўвекавечваў белавежскія краявіды і звярыну. Гэтак, як і яго папярэднік, у белавежскай пісьменнасці заставаўся дагэтуль амаль невядомым па прозвішчы — у адрозненне ад сваіх прац, якія звычайна функцыянуюць у шматлікіх рэпрадукцыях ананімна. Часам толькі называецца праца Брынкена як крыніца, з якой яна паходзіць. Варта тады коратка наблізіць чытачам постаць мастака.

Якуб Сакалоўскі нарадзіўся ў 1784 годзе ў Вычулках непадалёк Варшавы. Быў сынам памешчыка Ігнацыя і Юстыны з Грабоўскіх. Меў некалькі сясцёр. Выхоўваўся ў роднай вёсцы. Вельмі рана праявіў мастацкія здольнасці, якія развіваў у Варшаве пад кірункам Ф. Пінка. У 1805 годзе пераехаў з бацькамі ў Чулчыцы на Любліншчыне. Тут вельмі эмацыянальна перажыў разарванне заручынаў з Альбінай Свянціцкай. Хворы, акунуты ў меланхолію, доўгі час не мог займацца мастацтвам. Потым крыху працаваў у прыпалацавым тэатры ў Радзяёвіцах. Выступаў у п'есах на аматарскіх сцэнах Варшавы, рабіў мастацкае афармленне да спектакляў. Супольна з Юзэфам В. Красінскім састаўляў камедыйкі і песенькі, упрыгожваючы іх эскізамі. У „Gazecie Literackiej" змяшчаў дасціпныя вершыкі і рэцэнзіі на розныя творы.

Перад 1818 годам выехаў за мяжу. Быў у Венгрыі і Расіі. Падарожнічаў таксама па Італіі. Знаходзіў тамака матывы для эскізаў і акварэляў.

Найбольш важны перыяд творчасці Я. Сакалоўскага выпаў на 1818-1825 гады. Выканаў ён тады многа гумарыстычных партрэтаў варшаўскіх індывідуальнасцей і сталых наведвальнікаў радзяёвіцкага палаца. Супрацоўнічаў з літаграфічным прадпрыемствам Інстытута глуханямых у Варшаве. Прымаў удзел у наладжанні ў 1823 годзе мастацкай выстаўкі. Крыху раней, бо ў 1819 годзе, разам з Аляксандрам Хадкевічам выдаў першыя ў Варшаве літаграфаваныя эскізы жывёл. Сакалоўскі дапамагаў таксама Ф. К. Дзітрыху пры выкананні накідаў да працы „Monumentum regum Poloniae Cracoviensia". Яго творы трапілі таксама ў некалькі іншых кніжак і часопісаў (м.інш. у „Sylwan").

Пасля лістападаўскага паўстання 1830 года Я. Сакалоўскі пасяліўся на пастаяннае жыхарства ў Чулчыцах як вечны арандатар тамашняга маёнтка. Не вельмі спраўляўся так з гаспадаркай, як і з іншымі справамі. Знеахвоціўся таксама да мастацтва. Пападаў у штораз большую меланхолію. Памёр 2 лютага 1837 года ў 53-гадовым узросце ў вёсцы Букова ля Хелма-Люблінскага. Пахаваны на могільніку ў Чулчыцах.

Міхал Даманскі, аўтар біяграфічнага нарыса пра Якуба Сакалоўскага ў „Polskim Słowniku Biograficznym" (Год 2000, т. 40), вось гэтак ахарактарызаваў творчасць мастака: „Сакалоўскі быў самародным талентам; рысавальныя здольнасці выкарыстоўваў больш для забавы, чым прафесіянальна. У сваёй творчасці працягваў рэалізм у духу Яна Пётра Норбліна і Аляксандра Арлоўскага. Яго творы характарызуе моцная і энергічная рыска, калі-некалі простая і цвёрдая, але і кантрастная; даецца таксама прыкмеціць светаценевы эфект".

Працы Якуба Сакалоўскага толькі раз экспанаваліся на калектыўнай выстаўцы ў Львове ў 1894 годзе, значыць 57 гадоў пасля смерці мастака. Апрача дробнай жменькі даследчыкаў ніхто больш не аглядаў яго арыгінальных прац.

Ваяводскі літаратурны конкурс аб гісторыі рэгіёна

на легенду, дзённік, сямейную хроніку, гісторыю мясцовасці, установы, школы, прыхода, помнікаў даўніны, парку, могільніка і г.п.

пад лозунгам

НАША ГНЯЗДО

Шудзялава 2008

Арганізатары:

Гмінны асяродак анімацыі культуры і рэкрэацыі ў Шудзялаве

Гмінная ўправа ў Шудзялаве

Павятовае староства ў Саколцы

Мэты конкурсу:

1. Папулярызацыя і прамоцыя дакументаў — своеасаблівага запісу мінулага і паданняў лакальных грамадскасцей, асабліва важных у Аб'яднанай Еўропе.

2. Указанне жыцця лакальнай грамадскасці і яе дасягненняў маладому пакаленню.

3. Заахвочванне лакальнай грамадскасці пераказваць нашчадкам успаміны, запісы здарэнняў, ведаў і дакументаў аб „сваім гняздзе" — гміне, мясцовасці, школе, сям'і і т.п.

4. Фармаванне рэгіянальнай тоеснасці і пашаны для айчыннай традыцыі і культуры.

Правілы конкурсу:

1. Конкурс мае адкрыты характар і адрасуецца школам, прыходам, установам, згуртаванням, індывідуальным асобам.

2. Умова ўдзелу ў конкурсе — даслаць дакумент, хроніку, дзённік, успаміны, альбом або іншыя формы апісання мінулага, здарэнняў (у 2 экземплярах: арыгінал і копію), на ўласны кошт або асабіста даставіць іх, з абавязковай метрычкай з пакеткай:

— назвы ўстановы, згуртавання, школы, класа з адрасам,

— імя і прозвішча асоб, якія падрыхтавалі хроніку, запісы,

— імя і прозвішча настаўніка або апекуна ўдзельніка конкурсу.

3. На конкурс нельга дасылаць прац узнагароджаных на іншых конкурсах.

4. Пры ацэнцы пад увагу будуць узяты наступныя крытэрыі:

— агульная канцэпцыя прапанаванай працы,

— дакументальныя і пазнавальныя вартасці,

— змест запісаў, праблематыкі,

— стыль і правільнасць мовы,

— каштоўнасць ілюстрацый,

— дадатковыя матэрыялы (прыложаныя карты, эскізы, фатаграфіі, дакументы).

5. Арганізатары заахвочваюць удзельнікаў конкурсу да сінтэтычнага апісання гісторыі гмін (максімальна 5 старонак машынапісу), якое будзе публічна прэзентавацца аўтарамі **на ўрачыстым святкаванні 495 гадавіны стварэння Падляшскага ваяводства** ў Навагрудзе ў жніўні гэтага года.

Увага!

Камісія будзе звяртаць увагу, каб працы былі самастойнымі і не абапіраліся на апублікаваныя ўжо матэрыялы (манаграфіі, буклеты, даведнікі, інтэрнэт і т.п.).

6. Катэгорыі ўдзельнікаў:

I — падставовыя школы,

II — гімназіі,

III — звышгімназічныя школы,

IV — дарослыя,

V — спецыяльная катэгорыя **ГІСТОРЫЯ ГМІНЫ.**

7. Узнагароды

Арганізатары прадбачваюць тры галоўныя фінансавыя або рэчавыя ўзнагароды ў кожнай катэгорыі.

8. Працы трэба даслаць у тэрміне да 1 чэрвеня 2008 года на адрас:

GOAKiR
ul. Szkolna 12
16-113 Szudziałowo

Падвядзенне вынікаў конкурсу і ўручэнне ўзнагарод адбудзецца **12 чэрвеня 2008 г. а гадз. 10.00.**

Спяшайма любіць людзей...

Уладзімір СІДАРУК

У 18 нумары „Нівы” ад 4 мая 2008 г. друкаваўся тэкст Міры Лукшы „У сузор’і тых, хто адышоў...”, у якім аўтарка прыгадвае светлай памяці „белавежцаў”, якія адышлі ў вечнасць. Калі чытаў я гэтыя словы, сэрца запоўнілася журбою і ўспомніліся мне сустрэчы з блізкімі сэрцу сябрамі: Васілём Баршчэўскім, Віктарам Рудчыкам, Мікалаем Гайдуком і Міхасём Шаховічам. Усіх нас яднала супольная справа — распаўсюджванне роднага слова, беларускай культуры.

З Міхасём Шаховічам, напрыклад, яднала мяне сапраўдная дружба. Памятаю, як Міхась знаёміў мяне са сваім сябрам, паэтам Янам Леанчуком у памяшканні рэдакцыі, і як заязджалі мы ў Сакі, што непадалёк Пасынак, да ягоных бацькоў. Міхась уручыў мне тады альбом з паштовымі маркамі. „Вазьмі, Валодзя, дочкам завязеш, — гаварыў. — Памятка ад школы засталася”. І зборнічак вершаў „Святая ноч” яшчэ падарыў...

Ад Мікалая Гайдука захаваўся зборнік гістарычных эсэ „Паратунак” з надпісам: „Паважанаму дарагому сябру па пяру і мілейшаму чалавеку Валодзю Сідаруку з зычаннямі ўсяго найлепшага ў жыцці — Мікола Гайдук, 24.07.94 — Чаромха”.

З Віктарам Рудчыкам мы амаль

па-суседску жылі, бо ён выходзіў з Вулькі-Нурэцкай, што непадалёк Чаромхі знаходзіцца. Ягоны бацька, Максім, парламентарыем пры ПНР быў. Мо таму ад бацькі Віктар прыняў рэпарцёрскі псеўданім „Максім Нурэцкі”. Любіў я чытаць Рудчыкавы партызанскія апавяданні і рэпартажы. (Мо таму ў мяне зараз з’явілася цяга да веласіпедных вандровак і рэпарцёрскіх занатовак?). Дагэтуль захаваліся ў маім архіве памятныя здымкі са з’езда карэспандэнтаў, дзе ад мяне, тадышняга карэспандэнта года, узяў ён інтэрв’ю. Добразычлівы гэта быў чалавек і сардэчны калега і такім захаваўся ў маёй памяці.

Такім жа быў і Васіль Баршчэўскі. Я лічыў яго сваім старэйшым братам. Памятаю сустрэчы ў рэдакцыі і сяброўскія размовы, затым народны фэст у Белавежы, у якім мы ўдзельнічалі з навасадскімі самадзейнікамі. Прыемны ўспамін ад імпрэзы застаўся. У шасцідзесятых гадах гэта было. Пасля Баршчэўскі перайшоў у беластоцкія „Фасты” на пасаду галоўнага рэдактара завадской газеты. Гаварыў мне на развітанні: „Прыходзь, Валодзя, працаваць будзем разам”. Я аднак не адважыўся зрабіць такі крок, затым нашы кантакты абарваліся.

Вось такімі захаваліся ў маей памяці героі сузор’я „белавежцаў”, з якімі калісьці я сустракаўся. Сумныя гэта ўспаміны, але праўдзівыя. У дні Уваскрэсення Хрыстовага наведаў я кузаўскі могільнік, пакланіўся астанкам светлай памяці бацькоў, запаліў лампадку на іх магіле, затым рашыў прайсціся паміж помнікамі. Зацікавіў мяне надпіс на адным з іх: „Śpieszmy się kochać ludzi, bo tak szybko odchodzą...” Няхай гэтыя словы будуць сентэнцыяй як да сузор’я „белавежцаў” Міры Лукшы, так і майго допісу.

Фота Міры ЛУКШЫ

http://www.nation-sos.info

Калі параўноўваць беларускую нацыянальную самасвядомасць з самасвядомасцю суседніх народаў, то, здаецца, параўноўваць увогуле няма чаго. Дакладней, беларуская нацыянальная самасвядомасць практычна не існуе. Так, ёсць асобныя людзі, якія лічаць сябе беларусамі, імкнуцца захоўваць мову і культуру, але яны, як мовіцца, не робяць надвор’я на тэрыторыі паміж Польшчай і Расіяй, Літвой і Украінай. З таго вынікае сумная выснова, што гаварыць аб існаванні беларускай нацыі, па меншай меры, заўчасна.

Але ці так гэта на самой справе і ці сапраўды для беларусаў усё ніяк не наступіць час, калі яны змогуць, як і іншыя народы, „людзьмі звацца”? Для таго, каб з аптымізмам адказаць на гэтыя пытанні, варта зазірнуць на сайт, які называецца „Мы — нацыя”. Знаходзячыся менавіта на ім, разумееш, што сённяшняе „неіснаванне” беларускай нацыі — гэта ўсяго толькі знешняя абалонка тых працэсаў, якія адбываюцца ў беларускім грамадстве. Насамрэч, у цяперашні час ідзе глыбіннае фармаванне самасвядомасці тых людзей, якія можа праз дзесяць, а можа праз сто гадоў ужо не будуць цурацца сваіх каранёў, стануць паважаць беларускую мову і культуру. Для іх пытанне ці існуе беларуская нацыя будзе несці нешта незразумела-абразлівае, так, як успрымаюць падобнае пытанне аб сваіх народах палякі ці расіяне.

Сайт „Мы — нацыя” месціцца ў інтэрнэце па адрасе http://www.nation-sos.info. Выглядае ён даволі прывабна, асабліва, калі глядзець на верхнюю частку выяўлення. Бел-чырвона-белы сцяг, напісаная ўпэўненым почыркам назва сайта і дэвіз „Нацыя — гэта народ, які ў гістарычным калаўроце не пазбыўся сваёй духоўнай культуры і мовы” добра ўплываюць на настрой наведвальніка. Флэш-застаўка, якая адлюстроўвае нейкі пейзаж, падаецца крыху дзіўнай, бо тут мы можам убачыць падаючы снег і разам з тым лятаючых буслоў. Магчыма, стваральнікі сайта з’яўляюцца выключна гарадскімі людзьмі і не ведаюць, што зімой буслоў у Беларусі не знойдзеш. Хаця не выключана, што яны такім парадоксам хацелі нешта сказаць сваім віртуальным гасцям.

Варта адзначыць, што на сайце багата розных рубрык. Найбольш цікавымі з іх падаюцца „Адвечнае” і „Дзяржава і мы”. Кожная мае вялікую колькасць падрубрык, дзе змешчаныя навінныя паведамленні, а таксама аналітычныя артыкулы на тэмы палітыкі, эканомікі, культуры, гісторыі і сучасных беларускіх набалелых праблем.

На жаль, далёка не ўсе рубрыкі маюць нейкае напаўненне. Магчыма, у стваральнікаў сайта і яго натхняльнікаў яшчэ не даходзяць рукі, каб паведаміць цікаўным інтэрнэт-карыстальнікам аб апошніх навінках кнігавыдання ці аб водгуках палітычных рэпрэсій мінулага стагоддзя. Будзем спадзявацца, што ў хуткім часе ўсё гэта стане даступным. Тым больш, што дадзены сайт — вынік працы такіх слынных асоб Беларусі, як Адам Мальдзіс, Валерый Дранчук, Леанід Маракоў ці іншыя, пералічаныя на старонцы „Кантакты”. Такая персаніфікацыя адрознівае гэты сайт ад многіх сайтаў на падобную тэму ў лепшы бок, бо звычайна яны робяцца інкогніта.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Непрадказальны чэмпіянат

Айчынныя прыхільнікі баскетбола даўно не перажывалі такога цікавага нацыянальнага чэмпіянату сярод мужчынскіх клубаў. І хоць агульны ровень беларускага першынства невысокі, гэта кампенсуецца сапраўднай інтрыгай і непрадказальнасцю змагання камандаў мацнейшага квартэта. Выразна пацвердзілі гэта паўфінальныя баталіі серыі плэй-оф. На момант напісання гэтых радкоў адзін фіналіст ужо вядомы. Гэта асіповіцкі АЗАА, які ажно дзевяць гадоў не апынаўся вышэй „бронзы”. У паядынку „правінцыялаў” з „Мінскам-2006” якраз сталічнікі лічыліся фаварытамі, але серыя завяршылася з лікам 3-1 на карысць асіповіцкіх баскетбалістаў. Сапраўдным лідэрам у шэрагах АЗАА з’яўляецца Георгій Кандрусевіч, лепшы снайпер рэгулярнага першынства, які цяпер яшчэ больш узняў свае шанцы на тытул MVP чэмпіянату. Моцы асіповіцкай камандзе, якой першы сезон кіруе Андрэй Ольбрэхт, дадало і запрашэнне ў склад двух сербскіх легіянераў — Максімавіча і Рысціча. Ну, а „Мінск-2006”, дзе вылучаюцца шматгадовы цэнтравы зборнай Беларусі Аляксандар Куль і два амерыканскія гульцы — плэймейкер Стыгерс і форвард Блант, цяпер будзе біцца толькі за трэцяе месца.

У другой паўфінальнай серыі адбылася сапраўдная „сеча” паміж дзейсным чэмпіёнам мінскім „Віталюрам” і ўладальнікам Кубка Беларусі „Гродна-93”. Цікава, што ў складзе мінчан ажно чацвёра баскетбалістаў, якія свае лепшыя сезоны правялі якраз на берагах Нёмана. Уладзімір Шарко, Дзмітрый Зайцаў, Спартак Паграбнёў, Арсень Кучынскі з асаблівым настроем гуляюць супраць свайго ранейшага клуба. А ў складзе „Гродна-93”, які першы год узначальвае мясцовы дуэт Юрый Чарняк — Андрэй Васілеўка, застаўся толькі адзін карэнны выхаванец — цяжкі форвард Юрый Качан. Ну, а тон у шэрагах „Гродна-93” задаюць зараз украінскія легіянеры Лемік і Багданаў. Пасля чатырох сустрэч апанентаў лік быў роўным — 2-2 і зыход паўфінальнага змагання мусіў вырашыць заключны пяты матч у сталіцы. У кожным разе чэмпіянат выдаўся абсалютна цікавым.

А ў жаночым першынстве золата аспрэчваюць гродзенская „Алімпія” і барысаўская „Беразіна”. Першая сустрэча ў Барысаве завяршылася перамогай гаспадынь пляцоўкі. Якраз зараз чэмпіёнкі краіны „алімпійкі” перажываюць эпідэмію траўмаў і чарговае амаладжэнне. У пачатковай гульні за трэцяе месца „Мінск-2006” узяў верх над яшчэ адной гродзенскай камандай — „Вікторыяй”. У абодвух серыях змаганне будзе ісці да дзвюх перамог.

Усё менш часу застаецца да старту кваліфікацыйнага турніру ў Іспаніі, дзе жаночая зборная па баскетболе будзе імкнуцца прабіцца на пекінскую алімпіяду. Праграма падрыхтоўкі, спланаваная галоўным трэнерам Анатолем Буяльскім, змяшчае чатыры таварыскія гульні ў гасцях — па два спарынгі з дружынамі Чэхіі і Латвіі ў канцы траўня. Сам Буяльскі нядаўна прайшоў стажыроўку за акіянам — спецыяліст вельмі задаволены курсамі ў ЗША. Зараз галоўнае — сабраць у час усіх мацнейшых і пазбегнуць траўмаў.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Наш даўні пісьманосец

Рута

Колю Паланкевіча ў Трасцянцы ўсе ведаюць. Ён жа так доўга ездзіў па сваёй і акалічных вёсках, возячы людзям пісьмы, газеты, пасылкі, грошы... Ён проста быў пісьманосцам у 1957-1982 гадах. Адпрацаваў на пошце 25 год і 5 месяцаў. А цяпер ён пенсіянер.

Коля жыве адзін у бацькоўскай хаце. Цяпер шкадуе, што не ажаніўся, бо, як сам гаворыць, „жонка хоць кулеш зварыла б"! Гадаваўся Мікалай у мнагадзетнай сям'і, у якой дзеці радзіліся з 1921 па 1941 г. А было іх сямёра: 3 хлопчыкі і 4 дзяўчынкі. Коля нарадзіўся чацвёртым. Бацькі Ян і Марыя прывучалі дзетак да працы на невялікай гаспадарцы, бо трэба было неяк пракарміцца за санацыі. Коля памятае, як найстарэйшы яго брат Міша пасвіў кароў, каб падзарабіць на хлеб. Лягчэй сталі жыць пры саветах, бо бацька дастаў кавалак зямлі з падзелу маёнтка ў Стаўку. Брат Міша, як падрос, навучыўся ставіць печы, а Коля, скончыўшы 4 класы, памагаў бацьку ў гаспадарцы. Неяк усе перажылі тую страшную вайну, немцаў, а па вайне перад іхняй беднай сям'ёй адкрыліся новыя магчымасці, можна было пасяліцца ў горадзе.

Мікалай Паланкевіч

Найстарэйшы брат Міша пайшоў у прыступы ў недалёкія Алексічы, што пад Заблудавам, тры сястры і брат пайшлі вучыца і працаваць у Беласток і там пасяліліся, а Коля і сястра, якая хутка выйшла замуж — асталіся ў Трасцянцы. З 1951 па 1953 год Коля Паланкевіч адбыў вайсковую службу ў Пярэмышлі — вартаваў там польскую граніцу. А пасля войска працаваў год на мясцовай цагельні, каб зарабіць на вопратку.

У 1957 годзе мясцовая пошта патрабавала пісьманосца і Мікалай рашыўся тут стаць на працу. І працаваў доўгія гады.

Цяпер успамінае тыя гады з прыемнасцю: „З людзьмі я жыў добра, я ўсіх любіў і мяне любілі". І гэта праўда, бо і аўтарка гэтых слоў з пашанай успамінае супрацоўніцтва з пісьманосцам Колем.

А колькі „Нівы" ён насіў у сваёй сумцы! І сюды ў школу, і ў Бялкі, а ў Гознай не было хаты, дзе не чыталі б нашай газеты! Апрача таго людзі чыталі тут „Хлопску дрогу", „Пшыяцюлку", „Зялёны штандар", „Аграхэмію".

Працаваў Мікалай пад трыма кіраўнікамі: Смактуновічам з Нарвы, Тамашуком і Нінай Васілюк. Цяпер нашаму даўняму пісьманосцу ідзе 79 год, вочы дакучаюць, рукі не тыя, але ён як заўсёды ўсміхаецца і дорыць людзям зычлівыя словы як і даўней

„Чарнобыльскі шлях-2008" у Нью-Йорку

26 красавіка ля будынка ААН Беларускі моладзевы рух Амерыкі правёў дэманстрацыю, прысвечаную 22-й гадавіне тэхнагеннай катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, якая нанесла непапраўныя страты Беларусі.

У дэманстрацыі ўдзельнічала каля 35 чалавек якія прыехалі з розных куткоў Амерыкі — Нью-Йорка, Нью-Джэрсі, Мэна і другіх штатаў.

На пікеце выступіў старшыня Беларускага народнага фронту і лідэр КПХ-БНФ Зянон Пазьняк. Спадар Пазьняк распавёў пра трагедыю 1986 года і яе наступствы, нагадаў пра сітуацыю на Беларусі і заклікаў моладзь да актыўнай барацьбы з дыктатарскім рэжымам.

Сябры Беларускага моладзевага руху распавялі моладзі пра сваю дзейнасць і пра тое, што магчыма зрабіць агульнымі намаганнямі для дапамогі Бацькаўшчыне.

Жыве Беларусь!!!

www.belmov.org, www.belmovdc.org

Замаразкі

Веснавыя замаразкі прыносяць вялікія шкоды садам і цеплалюбівым культурам нашых агародаў, такім як агуркі, памідоры, фасоля, дыня. Замаразкі трымаюцца да паловы мая, а часам і даўжэй. Ад замаразкаў прымяняюць задымленне, палівы і розныя даступныя накрыцці.

Задымленне праводзіцца раніцай пры бязветраным надвор'і. Для гэтага спальваюць саламяны навоз, старую вільготную салому, сухое лісце, апілкі, смецце. Усё гэта раней складваецца ў кучы ад ветранага боку і пры паніжанай тэмпературы паветра падпальваюць. Дымавая заслона забяспечвае расліны ад непрацяглых замаразкаў да мінус 2-3 градусаў.

У барацьбе з замаразкамі вечарам паліваюць агарод вадой (50-100 літраў на 10 квадратных метраў). Чым больш вільготная глеба, тым больш яна цеплаёмістая. Добры паліў забяспечвае расліны ад замаразкаў на глебе да мінус 2 градусаў.

Невялікія плошчы цеплалюбівых культур можна накрываць рамамі, дошкамі, рагожай, мешкавінай, матамі, паперай, скрынкамі і іншымі даступнымі накрыццямі.

Мікола ВАРАНЕЦКІ

Дзіравая дарога

Калі пачалі будаваць дарогу Кляшчэлі — пагранпераход Полаўцы — Пяшчатка і ў выніку запаволіўся рух па прычыне ўвядзення светлавой сігналізацыі, тады большасць аўтамабіляў з Чаромхі-Станцыі пачала падавацца ў Кляшчэлі (і назад) праз Кузаву і Рэпчычы. Усё было б нядрэнна, каб не адно „але". Паколькі са станцыі ў Кузаву вядзе асфальтавая вуліца, то паміж Кузаваю і Рэпчычамі трэба адолець кіламетровы прамежак гравейкі. Дагэтуль жвіроўка была ненайлепшай якасці, а зараз, лепш не гаварыць — Садом ды Гамора. Адны дзіркі на дарозе. Найгорш каля кузаўскай царквы і на скрыжаванні, дзе разыходзяцца дарогі ў Рэпчычы і на могільнік. Там пасля ліўняў стварылася бяздонная багна. Ехаў я ў суботу (3 траўня) на могільнік і бачыў як аўтамабілі фарсіравалі лужы. Можна тут не толькі машыну паламаць, але і бэбахі вытрэсці. Няўжо не ведаюць аб гэтым чаромхаўскія чыноўнікі і Павятовае праўленне публічных дарог у Гайнаўцы? А мо проста прыплюшчваюць вочы і паводзяць сябе ў адпаведнасці з выслоўем „нічога не знаю, бо жыву з краю"?

(ус)

Адгаданка

1. хімічны элемент н-р 22, 2. тытул іспанскага вышэйшага дваранства, 3. чарнаморскі паўвостраў, 4. кліўлендскае возера, 5. орган нюху, 6. горад на Гродзеншчыне на рацэ Лідзея, 7. стары сасновы лес, 8. крыцкі вучань апостала Паўла, 9. кітайская грашовая адзінка, 10. александрыйскі заснавальнік арыянства, 11. форменнае паліто са складкай на спіне, 12. зімовае верхняе адзенне з футра, 13. бядровая частка свіной тушы, 14. палескі горад на Мухаўцы з музеем генералісімуса Суворава.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — нідэрландская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 14 нумара

Віза, госць, Іў, Кілія, кіч, Лівія, павець, поўня, Рось, сіг, трыёд, Чылі, Юхо, яд.

1	2								3		
					4		5			6	
					7		8				9
10						11	12				13
			14								

Рашэнне: **І сярод ільвоў ёсць гісторыкі, якія велічаюць подзвігі паляўнічых.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Галене Тапалянскай** з Трасцянкі і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: III kwartał 26 zł. do 5 czerwca 2008 r; IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. II półrocze 52 zł. do 5 czerwca 2008 r. II — IV kwartał 78 zł. do 5 marca 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.
Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52. **Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł. **Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BANK PEKAO S.A. O/Białystok 38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 750 egz.

Да пяцідзесяцігоддзя аб'яднання БЕЛАВЕЖА

Алесь Свісёк — ад самага пачатку

Міра ЛУКША

Адным з першых, хто паявіўся быў на літаратурных старонках „Нівы", быў Алесь Свісёк — так падпісваўся Аляксандр Батура, які прысылаў тэксты і паяўляўся на семінарах аж з Познаньшчыны — з мястэчка Рагозьна. У твар ведалі яго першыя члены літаратурнага аб'яднання, і застаўся ў іх памяці ды на здымках ягоны воблік — невысокага мужчыны з выразным тварам. Для мяне, асобы маладзейшай ад самой „Белавежы", асацыяваўся ён толькі з лікам са здымкаў і тэкстамі. З чымсьці блізкім мне, ды, можна сказаць, дапатопным, першасным.

З хваляваннем расшуквала я ў інтэрнэце звестак пра Аляксандра Батуру, хутчэй як пра забытага класіка знаёмага адно з пажаўцелых старонак. Мабыць, не спадзеючыся, што раптам сустрэну яго, дзякуй Богу якога жывога! А тут на табе: прачытала, што ў Пачатковай школе № 3 у Рагозьне праводзіўся дэкламатарскі конкурс вершаў Аляксандра Батуры ды нейкага іншага мясцовага паэта. Ну, вось, гэтак велічаюць, мабыць, толькі паэтаў, якія ўжо глядзяць з-пад зорак! — мільганула ў маёй страпёнай галаве. — ... Або нашага Віктара Шведа. А вось, як і Віктар, так і Алесь — з тае кагорты жывучых творцаў, плённых у кожным плане! Бо яшчэ і нарвалася я на адрас фірмы ягонага сына, які пражывае ў іншым падпазнаньскім мястэчку, і ён уцешыў мяне: Аляксандр Батура жыве! І чытае „Ніву" ад першага нумара!

І з вялікай радасцю і хваляваннем пачула я малады бадзёры голас белавежскага мастадонта! Адкуль ён узяўся ў нас, як дайшоў да беларускага слова?..

— Я радзіўся ў 1920 г. на Навагрудчыне, — пачынае пажылы паэт. — Быў у партызанах, у Налібоцкай пушчы, пад Любчай. Забралі мяне на прымусовыя працы ў Нямеччыну. Пасля вярнуўся — у партызанцы ўлюбіўся ў дзяўчыну, якая апынулася пад Познанем, Эвеліну. Яна і стала маёй жонкай. Што там расказваць... Добра ваяваў — на фронце скакаў з парашутам на тылы неямецкай арміі. Я за партызаншчыну меў атрымаць званне Героя Савецкага Саюза, але... Калі быў звольнены з арміі, пераехаў у Польшчу... Пра падзеі ваеннага часу яшчэ раскажу...

Аляксандр Батура яшчэ да вайны браўся за пяро, ды нідзе не друкаваўся. Якраз у „Ніве" паявіліся першыя яго тэксты.

— Ад самага пачатку я з „Нівай". Прынёс быў у 1956 годзе лістаноша спісак газет, на якія можна падпісацца. Я прачытаў: *Niwa, w języku białoruskim.* Падпісаўся на „Ніву". Пасля выслаў пару вершаў. Тады галоўны рэдактар Георгій Валкавыцкі прыслаў мне пісьмо, каб я падаслаў больш сваіх твораў. Выдалі мне тады адну старонку ў тыднёвіку. І патроху падсылаў я ў „Ніву" свае вершы. Надрукавалі мае тэксты і ў „Руні" ў 1959 годзе, пасля ў альманахах „Белавежы". Некалькі разоў прыязджаў я на сустрэчы — на семінары, на аўтарскія спатканні. Адкуль у мяне ўзяўся псеўданім „Алесь Свісёк"? Гэта па бацьку — ён, калі быў маленькі, не

Віктар Швед і Алесь Свісёк (1962 г.)

мог сказаць „цвічок", — казаў „сьвісёк". Так і застаўся па-вулічнаму Свіськом. Я раз так падпісаўся, не хацеў напісаць „Батура", і так засталося. Пасля падпісваўся ўжо „Аляксандр Батура". А як там іншыя сівавалосыя „белавежцы"? Швед трымаецца? Яму ж будзе толькі восемдзесят! Та-а-ак, я ведаю, што нядаўна быў юбілей. Усё ведаю з „Нівы"! Цяпер падпісваюся ў рэдакцыі, бо ў пісьманосца можна падпісацца толькі на мясцовую прэсу, што выдаецца ў нашым ваяводстве. Калі забываўся, пані Галінка мяне раней інфармавала, што пара падпісацца. Як мне падабаецца новая „Ніва"? Я чытаю найперш матэрыялы, якія датычаць Беларусі, Еўропы, асабліва першыя старонкі — артыкулы Вапы, Халадоўскага. Справы тыпова беластоцкія менш мяне цікавяць... Я праваслаўны. У мяне дзве дачкі і сын, якога вы сустрэлі шляхам інтэрнэту — ягоная фірма робіць каміны. У мяне чатырох унукаў, трох праўнукаў...

— Колькі гадоў Вы толькі чытач „Нівы"? Неяк Вы змоўклі... Проста не хочацца пісаць, ці ёсць якаясь прычына?

— Як не пішу будзе з дзесяць гадоў. Не хочацца мне прызнацца, чаму... Скажу. Падчас пабыўкі ў Мінску, гадоў з дзесяць таму... У адным магазіне прадаўшчыца на мяне гыркнула: „Гаварыце чалавечым языком!" Гэта называецца сталіца Беларусі, а не пачуеш беларускай мовы! Мне надта ж цяжка было гэтае перажыць. Адчуў такую безнадзейнасць беларускай справы. Не даў рады пісаць.

— У кожнага з нас былі такія перажыванні і прыкрыя сустрэчы, нейкі шок... Мы... трымаемся неяк на Беласточчыне!

— А ці вельмі часта пачуеш беларускую мову? Ні чорта не пачуеце! Вось, не толькі ў мяне такія перажыванні былі і ёсць. Адчуваю безнадзейнасць. Чытаў я нядаўна ў „Ніве" вашу размову з прафесарам Аляксандрам Баршчэўскім, што ён перажыў у Ісламы. Беларускія пісьменнікі! Чорт ведае што! Я нейкі ўжо.. можа... стары зрабіўся.

— У нас у „Ніве" таксама змены — у гэты момант і я раблюся... найстарэйшай! Ды тыя сівавалосыя не пакідаюць „Нівы", пішуць, карыстаючыся новай тэхнікай, і рэдактар Валкавыцкі нас не абмінае. Паэт і рэдактар перавёў і „Ніву", і „Белавежу" праз усе рыфы і мы, наступнае пакаленне, вельмі яму ўдзячныя. Не можам звешваць галоў, мусім адзін аднаму дадаваць духу, і выхоўваць маладых... Вось Віктар Швед страпянуўся, не наракаючы, вядзе новае жыццё, плённа працуе... І ў „Зорку" піша...

— О, і „Зорка" мне падабаецца, і там маладыя прабуюць пяра! Я сляджу за тым, што адбываецца ў „Ніве" і з „Нівай". Вось перада мною новая „Ніва", і якраз „Зорку" чытаю! І вашы вершы нядаўна чытаў пра тутэйшых звяркоў. І Віктар цешыць.

— Можа, і Вы напішаце нам штосьці? Калі не вершы, дый нейкія развагі. Ёсць пра што ўспомніць! Запрашаем Вас на юбілей „Белавежы" 28-29 чэрвеня. Будзе канферэнцыя, выступы. І проста сустрэча ўсіх, хто столькі не бачыўся, а пачынаў беларускі літаратурны рух у Польшчы і дзейнічаў у ім.

— Падвязе мяне сын! Пабачымся, дай Бог! І тады больш паразмаўляем! Перадайце прывітанне перадусім Юрку Валкавыцкаму. Ён не толькі мне шмат дабра зрабіў, падтрымаў на духу — таксама і тым, што не забыўся пра мяне ў „Букеце Белавежжа"! Вельмі добры чалавек, Богам даны для беларускай справы.

— Каб мы ўсе ў здароўі дачакаліся юбілею! А тады раскажаце нам хоць бы і пра сваю партызанскую дзейнасць.

— Ой, будзе пра што пагаварыць!

Алесь СВІСЁК

Маладой настаўніцы

Вокны адчынены,
і шум вясёлы
разносіцца далёка
па палях.
А ты
замерла на парозе школы —
рука ў паветры,
ўся душа ў вачах.
Каханая!
Хвалюешся глыбока.
Табе і радасна,
крыху і страх.
І ў даль шырокую
імкнецца вока,
каб угадаць
жыццёвы новы шлях.
Ён не засланы кветкамі,
ні золатам,
Але і ты
за лепшы свет
змагар.
Мэта — волат!
А ўсім мэтам — волатам
трэба
вялікай працы
і ахвяр.
Не раз, я знаю
цяжка табе будзе:
Няўдачы і журба
перад табой,
за сэрца
сэрцам не заўсёды плацяць людзі,
зашкліцца вока горкаю слязой.
Але тады
дзіцячыя засвецяць вочы
даверліва і шчыра
табе ў твар,
Растопяць крыўду
і ты зноў захочаш
для іх
аддаць жыццё,
ўвесь сэрца жар.
Бо няма скарбу большага,
як дзеці,
А ты
каваль іх душ,
дык куй смялей!
Бо няма
гонару вышэйшага
на свеце —
сапраўдных
свету выкаваць людзей.

1958 г.

11.05 — 17.05

(22.03. — 20.04.) Партнёрскія і сяброўскія адносіны будуць самымі памыснымі. З 15.05. не ангажуйся ў дзеянні, якія апрача сумніўнага задавальнення не прынясуць ніякага прыбытку. Рыхтуецца палымяны раман, пасля якога цяжка будзе табе апрытомнець.

(21.04. — 21.05.) Можа папсавацца табе здароўе. Будзеш менш плённым, на шмат спраў будзеш глядзець праз прызму былых параз. Не дай сябе загнаць у казіны рог! Не зыходзь з абранага курсу!

(22.05. — 22.06.) Калі ў пачуццях захаваеш памяркоўнасць, пазбегнеш расчараванняў. Могуць нахлынуць на цябе сумныя думы, пачуццё недахопу перспектыў, злосць і празмернае крытыканства. Ды настрой будзе папраўляцца! Новыя шанцы ў хатніх справах.

(23.06. — 23.07.) Дазволіш расцугліцца жарсцям і не будзеш звяртаць увагу на тое, што аб табе гавораць іншыя! Ракі, народжаныя пасля 17.07., змогуць пераносіць горы! Ракам з 12-16.07. прадбачваюцца добрыя выпадкі. Справішся з выпрабаваннем лёсу.

(24.07. — 23.08.) 10-14.05. рыхтуецца няспынная пасма поспехаў — найбольш у прафесійных і фінансавых справах. 12-16.05. зважай на людзей — хтосьці схоча выкарыстаць тваю дабрыню і наіўнасць; таксама і партнёр можа цябе падмануць. Дарэчы, без захопніцтва ў пачуццях!

(24.08. — 23.09.) У пачуццях будзь больш непасрэднай. Усё зменіцца на лепшае. Затое вырашаючы аб прафесійным — не паддавайся сантыментам. Беспадстаўныя апаскі наконт свайго здароўя.

(24.09. — 23.10.) З 16.05. адчуеш, што ты быццам у шапачцы народжаны! Сваім аптымізмам і адкрытасцю з'яднаеш сімпатыю атачэння. З 15.05. зважай, каб каго не параніць. У пачуццях ты шчыры і адданы, нават без узаемнасці.

(24.10. — 22.11.) Прыцягваць цябе будуць асобы ад цябе зусім адрозныя. Перад табой удалыя падарожжы і шмат прафесійных поспехаў. Буйнее тваё кампанейскае жыццё. Могуць пабольваць запушчаныя зуб ці гланды.

(23.11. — 22.12.) З 16.05. пачне аж заліваць цябе струмень шчасных хвілін! Варта падумаць аб пакупках, інвестыцыях, карысным крэдыце. Будзеш не толькі гарачым, але і патрабавальным партнёрам!

(23.12. — 20.01.) Новае каханне будзеш распешчваць і проста насіць на руках. Не пазбягай добрай кампаніі, знакамітай забавы, смачных напояў і страў. Здзейсніцца як знакаміты працаўнік і клапатлівы шэф. Пачуццё патрэбы глыбокай перамены жыцця.

(21.01. — 19.02.) Да 14.05. будуць выклёўвацца ў тваёй галаве толькі геніяльныя ідэі. З 16.05. — свабода выказвання пачуццяў, лёгкасць наладжвання кантактаў (могуць яны стаць надта цікавымі знаёмствамі). Будзеш вельмі папулярным у кампаніі. Можаш назбіраць грошай без лішняй ашчаднасці.

(20.02. — 21.03.) Не слухай нічыіх парад, асабліва асоб, якія хочуць цябе знеахвоціць (іх клопат папахвае зайздрасцю). На тваёй дарозе могуць паявіцца рыфы, ды абмінеш іх шчасліва, асабліва калі трапна разгледзіш сітуацыю. Кіруйся інстынктам, ды не забывайся на здаровы розум!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960